## ЗЬМЕСТ

ПЕРШАЯ ГАДЗІНА……………………………………… 3

ТРЭЦЬЦЯ ГАДЗІНА………………………………......... 10

ШОСТАЯ ГАДЗІНА……………………………………... 15

ДЗЕВЯТАЯ ГАДЗІНА………………………………........ 22

ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ………………………………………….. 30

НА ВЯЛІКАЙ ВЯЧОРНЯЙ……………………………... 35

НА РАНІШНЯЙ…………………………………………. 57

НА ЛІТУРГІІ…………………………………………….. 72





# СЬВЯТОЕ БОГАЯЎЛЕНЬНЯ.

# ХРОСТ ГОСПАДА БОГА І ЗБАЎЦЫ НАШАГА ІСУСА ХРЫСТА

**(6 СТУДЗЕНЯ)**

ЛЬВОЎ
л.Б 2007



Парахфія свт. Кірыла Тураўскага, г.Львоў

Складзена сьвятаром Сяржуком Горбікам,

Біблійныя тэксты пададзены згодна перакладу

спадара Васіля Сёмухі

Дзеля служэньня ў

Беларускім Праваслаўным Абрадзе

Дабраслаў, Госпад, працу нягоднага слугі Твайго



**Верш:** Голас Гасподні над водамі, Бог славы загрымеў, Гасподзь над вялікімі водамі.

**Пс 28:1, 3**

*Евангельля ад Мацьвея, пачатак 6.*

**Замест “Годна”**

Узьвялічвай, душа мая, / гонарам вышейшую Нябёсных паўкоў / Дзеву Ўсячыстую Богародзіцу.

**Ірмас, тон 2:** Ніякая мова не ў сілах усхваліць па годнасьці, / і нават вышэйшы сусьвету розум губляецца, - / як апяваць Цябе, Богародзіца; / але як Добрая, заклад вернасьці прымі, / бо Ты ведаеш і любоў боскую нашу, / бо Ты - Заступніца хрысьціянаў, / Цябе мы узьвялічваем.

*І да адданьня сьвята:*

**Прычасьнік**

Бо зьявілася мілата Божая, ратавальная ўсім людзям. Алілуя. *(3)*

**Ціт 2:11**



**Верш 4:** Хай скажуць сёньня, хто баіцца Госпада: / Ён добры, бо вечная ласка Ягоная.

**Пс 117:4**

**Трапар:** Пры вадохрышчы Тваім у Ярдане, Госпад, / адкрылася пакланеньня Тройцы: / бо голас Айца сьведчыў аб Табе, / умілаваным Цябе Сынам мянуючы, / і Дух у выглядзе голубя / пацвярджаў Яго слова няўхільнасьць. / З'явіўшыся Хрысьце Божа / і сусьвет адукаваўшы, слава Табе!

### Уваход

Дабраславёны, хто ідзе ў імя Госпаднае! / Дабраслаўляем вас з дома Госпаднага, / Бог - Госпадзь, / і апрамяніў нас.

**Пс 117:26 – 27а**

**Трапар:** Пры вадохрышчы Тваім у Ярдане, Госпад, / адкрылася пакланеньня Тройцы: / бо голас Айца сьведчыў аб Табе, / умілаваным Цябе Сынам мянуючы, / і Дух у выглядзе голубя / пацвярджаў Яго слова няўхільнасьць. / З'явіўшыся Хрысьце Божа / і сусьвет адукаваўшы, слава Табе!

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

### Кандак, тон 4

З'явіўся Ты ў гэты дзень сусьвету, / і сьвятло Твае, Госпад, захаваўся на нас, / у поўнасьці веданьня асьпяваючых Цябе: / “Прыйшоў, з'явіўся Ты, / Сьвятло непрыступнае!”

**Замест трысьвятога:** Колькі вас у Хрыста ні хрысьціліся, / у Хрыста вы ўсі апрануліся. Алілуя. *(3)*

### Пракімен, тон 4

Дабраславёны, хто ідзе ў імя Госпаднае!, / Бог - Госпадзь, і апрамяніў нас.

**Верш:** Слаўце Госпада, бо Ён добры, / бо вечная ласка Ягоная.

**Пс 117:26а, 27а, 1**

*Да Ціта пасланьня Апостала Паўла, пачатак 302а.*

### Алілуя, тон 4

**Верш:** Аддайце Госпаду, сыны Божыя, аддайце Госпаду славу і чту.



# ПАСЬЛЯДОЎНАСЬЦЬ ГАДЗІН У НАВЯЧОР’Я АСЬВЕТНІЦТВА

## ПЕРШАЯ ГАДЗІНА

**Сьвятар:** Дабраслаўлёны Бог наш, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Людзі:** Амін.

**Чытальнік:** Слава Табе, Божа наш, слава Табе.

Уладару нябесны, Уцяшыцелю, Духу ісьціны, што ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра й Жыцьцядацелю, прыйдзі і ўсяліся ў нас і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў, Добры, душы нашы.

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Усясьвятая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе, памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Твае, прыдзі ўладарства Твае, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзёнага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар**[1]**:** Бо Тваё ёсьць валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Чытальнік:** Амін.

Госпадзі, памілуй. *(дванадцаць разоў)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і ўвесь час, і

[1] Пасьля выгаласа сьвятар кадзіць Евангельля, абразы, увесь храм і вернікаў згодна чыну.

на вякі вякоў. Амін.

Прыйдзеце, пакланемся Ўладару нашаму Богу.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да Хрыста, Уладара, нашага Бога.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да самога Хрыста, Уладара й Бога нашага.

## Псальма 5

Пачуй, Госпадзе, словы мае, зразумей мае помыслы. Дай увагі енку скаргі маёй, Цару мой і мой Божа! Я малюся Табе. Госпадзе! раніцай голас пачуй мой, - раніцай стану прад Табою і буду чакаць. Бо Ты, Божа, беззаконьняў ня любіш; ліхадзей пры Табе не аселіцца; бязбожнікі прад вачыма Тваімі ня выстаяць: Ты ненавідзіш усіх ліхадзеяў. Ты загубіш усіх ашуканцаў; крыважэрцамі і падступнымі Гасподзь пагарджае. А я, зь вялікай ласкі Тваёй, увайду ў харомы Твае, пакланюся храму сьвятому твайму богабаязна. Госпадзе! вядзі мяне па дарозе ў праўдзе Тваёй, на супастатаў маіх; спрастуй перада мною дарогу Тваю. Бо ў іх вуснах праўды няма: сэрца іхняе - згубнасьць, горла іхняе - дамавіна адчыненая, лісьлівяць яны языком сваім. Асудзі іх, Божа! Няхай прападуць ад намыслаў сваіх; за ліхадзействы вялікія адкінь іх, бо яны ўзбунтаваліся на Цябе. А ўсе, хто на Цябе спадзяецца, будуць радавацца вечна; і Ты будзеш іх асланяць; і будуць хваліцца Табою тыя, хто любіць імя Тваё. Дабраслаўляеш Ты, Госпадзе, праведніка; упадабаньнем, нібы шчытом, ахінаеш яго.

## Псальма 22

Гасподзь - Пастыр мой; я ніякай нястачы ня мецьму: Ён пасьвіць мяне на пашах зялёных, на ціхія воды водзіць мяне. Ён душу маю мацуе, кіруе мяне на сьцежкі праўды дзеля імя Свайго. Калі я пайду далінай сьмяротнага ценю, не ўбаюся ліха, бо Ты са мною; Тваё жазло і твой посах - яны супакойваюць мяне. Ты перада мною паставіў трапезу на вачах у маіх ворагаў; намасьціў алеем галаву маю; чара мая



Збаў нас, Сын Боскі, у Ярдане хрысьціўшыся, / сьпяваючых Табе: алілуя.

**Верш 4:** Гасподзь літасьцівы і справядлівы, / міласэрны Бог наш.

**Пс 114:5**

Збаў нас, Сын Боскі, у Ярдане хрысьціўшыся, / сьпяваючых Табе: алілуя.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Адзінародны Сыне:

## Антыфон 3, тон 1

**Верш 1:** Слаўце Госпада, бо Ён добры, / бо вечная ласка Ягоная!

**Пс 117:1**

## Трапар, тон 1

Пры вадохрышчы Тваім у Ярдане, Госпад, / адкрылася пакланеньня Тройцы: / бо голас Айца сьведчыў аб Табе, / умілаваным Цябе Сынам мянуючы, / і Дух у выглядзе голубя / пацвярджаў Яго слова няўхільнасьць. / З'явіўшыся Хрысьце Божа / і сусьвет адукаваўшы, слава Табе!

**Верш 2:** Хай скажа сёньня дом Ізраілеў: / Ён добры, бо вечная ласка Ягоная.

**Пс 117:2**

**Трапар:** Пры вадохрышчы Тваім у Ярдане, Госпад, / адкрылася пакланеньня Тройцы: / бо голас Айца сьведчыў аб Табе, / умілаваным Цябе Сынам мянуючы, / і Дух у выглядзе голубя / пацвярджаў Яго слова няўхільнасьць. / З'явіўшыся Хрысьце Божа / і сусьвет адукаваўшы, слава Табе!

**Верш 3:** Хай скажа сёньня дом Ааронаў: / Ён добры, бо вечная ласка Ягоная.

**Пс 117:3**

**Трапар:** Пры вадохрышчы Тваім у Ярдане, Госпад, / адкрылася пакланеньня Тройцы: / бо голас Айца сьведчыў аб Табе, / умілаваным Цябе Сынам мянуючы, / і Дух у выглядзе голубя / пацвярджаў Яго слова няўхільнасьць. / З'явіўшыся Хрысьце Божа / і сусьвет адукаваўшы, слава Табе!

## НА ЛІТУРГІІ

### Антыфон 1, тон 1

**Верш 1:** Калі выйшаў Ізраіль зь Егіпта, дом Якава - з народу іншапляменнага.

**Пс 113:1**

Малітвам Богародзіцы, Збаўца, збаў нас.

**Верш 2:** Юда зрабіўся сьвятыняю Ягонаю, / Ізраіль - валоданьнем Ягоным.

**Пс 113:2**

Малітвам Богародзіцы, Збаўца, збаў нас.

**Верш 3:** Мора ўгледзела, і пабегла; / Ярдан павярнуўся назад.

**Пс 113:3**

Малітвам Богародзіцы, Збаўца, збаў нас.

**Верш 4:** Што з табою, мора, чаго ты пабегла, / і з табою, Ярдане, чаго павярнуўся назад?

**Пс 113:5**

Малітвам Богародзіцы, Збаўца, збаў нас.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Малітвам Богародзіцы, Збаўца, збаў нас.

### Антыфон 2, тон 2

**Верш 1:** Я радуюся, што Гасподзь пачуў голас мой, / малітву маю.

**Пс 114:1**

Збаў нас, Сын Боскі, у Ярдане хрысьціўшыся, / сьпяваючых Табе: алілуя.

**Верш 2:** Прыхіліў да мяне вуха Сваё; / і таму буду клікаць Яго ўсе дні мае.

**Пс 114:2**

Збаў нас, Сын Боскі, у Ярдане хрысьціўшыся, / сьпяваючых Табе: алілуя.

**Верш 3:** Агарнулі мяне хваробы сьмяротныя, пакуты пякельныя агарнулі мяне; / сустрэў я ўціскі і смуткі, тады клікнуў я імя Гасподняе.

**Пс 114:3 – 4а**



перапоўнена. Так, ласка і мілажаль хай будуць са мною ва ўсе дні жыцьця майго, і я буду ў доме Гасподнім многія дні.

### Псальма 26

Гасподзь - сьвятло маё і ратунак мой: каго мне баяцца? Гасподзь - цьвярдыня жыцьця майго: каго мне палохацца? Калі будуць наступаць на мяне зласьліўцы, супастаты і ворагі мае, каб зжэрці цела маё, яны спатыкнуцца самі і ўпадуць. Калі выступіць супраць мяне кагорта, не збаіцца сэрца маё; калі на мяне паўстане вайна, і тады спадзявацца буду. Аднаго я прасіў у Госпада, толькі таго шукаю, каб жыць мне ў доме Гасподнім ва ўсе дні жыцьця майго, сузіраць хараство Гасподняе і наведваць сьвятыню Ягоную; бо Ён схаваў бы мяне ў Сваёй скініі ў дзень няшчасьця; схаваў бы мяне ў патайным месцы Свайго селішча, узьнёс бы мяне на скалу. Тады ўзьнеслася б галава мая над ворагамі наўкола мяне; і прынёс бы я ў Ягонай скініі ахвяры славаслоўя; сьпяваў бы і славіў бы прад Госпадам. Пачуй, Госпадзе, голас мой, якім я клічу; зьлітуйся зь мяне і азьвіся мне. Сэрца маё кажа ад Цябе: “шукайце аблічча Майго”; і я буду шукаць аблічча Тваё, Госпадзе. Не схавай ад мяне аблічча Твайго, не адкінь у гневе раба Твайго. Ты быў мой памочнік; не гані мяне і не пакінь мяне, Божа, Ратаўнік мой! Бо мой бацька і маці мая кінулі мяне; але Гасподзь мяне прыме; навучы мяне, Госпадзе, шляху Твайму, і накіруй мяне на сьцежку праўды, дзеля ворагаў маіх; не выдавай мяне сваволі ворагаў маіх; бо паўсталі на мяне сьведкі аблудныя і дыхаюць злосьцю. Але я веру, што ўбачу даброць Гасподнюю на зямлі жывых. Май надзею на Госпада, будзь мужны; і хай мацуецца сэрца тваё, май надзею на Госпада.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя, слава Табе, Божа. *(тры разы)*

Госпадзі, памілуй. *(тры разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

### Трапар, тон 4

Назад пацякла некалі Ярдан-рака / ад дабрыні Ялісея па

ушэсьці Ільлі, / і падзяляліся воды туды і сюды, / і стаў дзеля яго сухім шлях па вільгаці, / як правобраз праўдзівы вадохрышча, / якім мы пераходзім шлях цякучага жыцьця. / Хрыстос з'явіўся ў Ярдане, асьвячаючы воды.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Багародзічны:** Як назваць нам Цябе, о Дабрадатная? / Небам? Бо праз Цябе зазьзяла Сонца праўды. / Раем? Бо узрасьціла Ты Кветку нятленьня. / Дзевай? Бо Ты была нятленнай. / Чыстай Маці? Бо трымала ў сьвятых Тваіх абдымках Сына, усіх Бога. / Яго молі аб выратаваньні душаў нашых.

### Вершыры першай гадзіны, тон 8. Твор Сафронія, патрыярха Ерусалімскага

У гэты дзень асьвячаецца вод існасьць, / і падзяляецца Ярдан, / і стрымлівае шлях бруй сваіх, / бачачы Уладара амываемым. (2)

**Верш:** Бо я пра Цябе ўспамінаю / зь зямлі Ярданскай, зь Ярмона, з гары Цаар

**Пс 41:7б**

Як чалавек да ракі прыйшоў Ты, Цар-Хрыстос, / і слугі сьпяшаешся прыняць вадохрышча, Добры, / ад рук Папярэдніка / для ачышчэньня грахоў нашых, Чалавекалюбчы.

**Верш:** Бачылі Цябе, Божа, воды, бачылі Цябе воды, і напалохаліся**.**

**Пс 76:17а**

Як чалавек да ракі прыйшоў Ты, Цар-Хрыстос, / і слугі сьпяшаешся прыняць вадохрышча, Добры, / ад рук Папярэдніка / для ачышчэньня грахоў нашых, Чалавекалюбчы.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Да голасу клікаючага ў пустэльні: / "Прыгатуйце шлях Госпаду" / прыйшоў Ты, Госпад, прыняўшы выяву слугі, / просячы аб вадохрышчы, не ведаючы граху. / Убачылі Цябе воды і жахнуліся, / у трапятаньне прыйшоў Папярэднік і выклікнуў гаворачы: / "Як сьвяцільнік адукуе Сьвятло? / Як



/ Зямная з'ява - / і вышэй нябёсаў спасьцігаемае розумам. / Праз абмываньне - выратаваньне, а праз ваду - Дух. / Праз апусканьне здзяйсьняецца / наша да Бога узыходжаньне. / Цудоўныя справы Твае, Госпад! Слава Табе!

Апранаючы нябёсы аблокамі, / апранаецца ў гэты дзень у бруі Ярданскія, / і мне належным ачышчэньнем чысьціцца / Прымаючы сусьвету грэх. / І прымае сьведчаньне звыш ад сураднога Сабе Духу / Сын Адзінароднага Найвысокага Айца. / Да Яго засьпяваем: / "З'явіўшыся і Выратавашыў нас, / Хрысьце Божа наш, слава Табе!"

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Тон 6, Анатоля:** Водамі Ярданскімі апрануўся Ты Выратавальнік, / Апранаючыся сьвятлом, як вопраткаю, / і схіліў галаву перад Папярэднікам, / неба Вымярыўшы далонькю, / каб зьвярнуць сусьвет ад памылкі / і выратаваць душы нашы.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 2, Анатоля:** У гэты дзень Хрыстос на Ярдан прыйшоў хрысьціцеся, / у гэты дзень Ян дакранаецца галавы Уладара. / Сілы нябесныя жахнуліся, бачачы цудоўную таямніцу. / Моры убачыла і пабегла; / Ярдан, убачыўшы, павярнуў воды свае. / Мы жа, адукаваўшыся, заклікаем: / "Слава з'явішамуся Богу, / і на зямлі бачанаму, / і адукаваўшаму сусьвет!"

*Вялікае славаслоўе.*

### Вотпуск

У Ярдане хрэсьціцца дабраваліўшы ад Яна дзеля нашага выратаваньня Хрыстос, праўдзівы Бог наш, па малітвах усячыстай Сваёй Маці, сьвятых слаўных і усяхвальных Апосталаў і усіх сьвятых памілуе і выратуе нас, як добры і Чалавекалюбчы.

У гэты дзень Уладар / прымае вадохрышча рукой Папярэднікі.

Ты памазваеш Духа зносінамі / сьмяротную існасьць, узводзячы да дасканаласьці, / бруямі чыстымі ачысьціўшы яе, Цар безпачатковы, / і, перамогшы напышліваю моц цемры, / цяпер аддаеш ёй бясконцае жыцьцё.

Узьвялічвай, душа мая, / гонарам вышэйшую Нябесных палкоў / Дзеву Усячыстую Богародзіцу.

Ніякая мова не ў сілах усхваліць па годнасьці, / і нават вышэйшы сусьвету розум губляецца, - / як апяваць Цябе, Богародзіца; / але як Добрая, заклад вернасьці прымі, / бо Ты ведаеш і любоў боскую нашу, / бо Ты - Заступніца хрысьціянаў, / Цябе мы узьвялічваем.

У гэты дзень Уладар / схіляе галаву пад руку Папярэдніка.

О перабольшываючы розум цуд нараджэньня ад Цябе, / Нявеста усячыстая, Маці дабраслаўлёная! / Атрымаўшы праз Цябе цалкавітае выратаваньне, / мы годна апладыруем Табе, як Дабрадзейцы, / у падарунак прыносячы песьню падзякі.

*Паклон.*

### Сваціільны

З'явіўся Выратавальнік - дабрыня і ісьціна ў бруях Ярдана, / і сьпячых у цемры і цені адукаваў. / Бо прыйшоў Ён, з'явілася Сьвятло непрыступнае. (3)

### На "хваліце" вершыры на 4, тон 1, патрыярха Гэрмана

Як Сьвятло ад Сьвятла зазьзяў сусьвету / Хрыстос Выратавальнік наш, з'явіўшыся Бог. / Паклонімся Яму, людзі! Як Цябе, Уладара, / мы, слугі, годна ушануем? / Бо Ты, Хрысьце, / у водах усіх нас абнавіў.

Ты, хрост прыняўшы ў Ярдане, Выратавальнік наш, / бруі яго высьвяціў, / прымаючы ускладаньне рукі слугі / і пакуты сусьвету вылечваючы. / Вяліка таямніца домабудаваньня Твайго! / Чалавекалюбчы, слава Табе!

Праўдзівае Сьвятло з'явілася, / і усім асьвету падае. / Хрэсьціцца з намі Хрыстос, / Той, Хто вышэй усякай чысьціні. / Пасылае асьвячэньне вадзе, / і гэта робіцца асьвячэньнем душаў.



ускладзе руку слугі на Уладара? / Асьвяці мяне і воды, Выратавальнік, прымаючы сусьвету грахі!"

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Да голасу клікаючага ў пустэльні: / "Прыгатуйце шлях Госпаду" / прыйшоў Ты, Госпад, прыняўшы выяву слугі, / просячы аб вадохрышчы, не ведаючы граху. / Убачылі Цябе воды і жахнуліся, / у трапятаньне прыйшоў Папярэднік і выклікнуў гаворачы: / "Як сьвяцільнік адукуе Сьвятло? / Як ускладзе руку слугі на Уладара? / Асьвяці мяне і воды, Выратавальнік, прымаючы сусьвету грахі!"

### Пракімен, тон 4

І загрымеў у нябёсах Гасподзь, / і падаў Усявышні Свой голас, / град і вогненнае вугольле.

**Верш:** Палюблю Цябе, Госпадзе, моц мая! / Гасподзь мой прытулак і цьвярдыня мая.

**Пс 17:14, 2 – 3а**

### Прароцтваў Ісаі чытаньня.

Разьвесяліцца пустыня і сухая зямля, і зарадуецца краіна ненаселеная і расквітнее як нарцыс; цудоўна будзе цьвісьці і радавацца, будзе ўрачысьціцца і сьвяткаваць; слава Лівана дасца ёй, хараство Карміла і Сарона; яны ўбачаць славу Госпада, веліч Бога нашага. Умацуйце аслабелыя рукі, і ўцьвердзіце калені дрыготкія; скажэце нясьмелым душою: будзьце цьвёрдыя, ня бойцеся; вось Бог ваш, прыйдзе помста, адплата Божая; Ён прыйдзе і збавіць вас. Тады адамкнуцца вочы сьляпых, і вушы глухіх расчыняцца. Тады кульгавы падхопіцца, як алень, і язык нямка засьпявае; бо праб'юцца воды ў пустыні і ў стэпе патокі. ператворыцца прывід водаў у возера, і спрагненая зямля - у крыніцы водаў; у жытлішчы шакалаў, дзе яны спачываюць, будзе месца пад трысьнёг і чарот. І будзе там вялікая дарога, і шлях па ёй назавецца шляхам сьвятым; нячысты ня будзе хадзіць па ім; але ён будзе ім адным. Хто пойдзе гэтым шляхам, нават і нявопытныя, не заблудзяцца. Ільва там ня будзе, і драпежны зьвер ня ўзыдзе

на яго; яго ня знойдзецца там, а хадзіцьмуць адкупленыя. І вернуцца збаўленыя Госпадам, прыйдуць на Сіён з радасным гоманам; і радасьць вечная будзе над галавою ў іх; яны знойдуць радасьць і весялосьць, а смутак і зітханьне адыдуць.

**Іс 35:1 – 10**

*Дзеі сьвятых Апосталаў, пачатак 33.*

*Евангельля ад Мацьвея, пачатак 5.*

Умацуй ногі мае ў слове Тваім, і ня дай авалодаць мною ніякаму беззаконьню.

Вызвалі мяне ад прыгнёту чалавечага, і буду наказы Твае шанаваць.

Апрамень раба Твайго сьвятлом аблічча Твайго, і навучы мяне пастановам Тваім.

**Пс 118:133 – 135**

Няхай вусны мае хвалою напоўняцца, каб я Табе славу сьпяваў, кожны дзень апяваў Тваю веліч.

**Пс 70:8**

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Усясьвятая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бясправые наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе, памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Твае, прыдзі ўладарства Твае, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзёнага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё ёсьць валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Чытальнік:** Амін.



Прарок, прыйдзі да Мяне, / працягні руку і хрэсьці Мяне хутчэй.

Прарок, пакінь цяпер і хрэсьці Мяне, жадаючага таго, / бо Я прыйшоў выканаць усялякую праўду.

Ды захоўвае нас, верныя, / дабрыня і Духу пячатка: / бо як у старажытнасьці згубы пазьбеглі Жыды, / калі вушакі дзьвярэй былі пашмараваныя крывёй, / так і нам гэтая боская хрысьціяльня адраджэньня будзе сыходам, / тады мы і убачым Тройцы сьвятло патаемная.

*Сьпяваем прысьеў другога канона:*

У гэты дзень Уладар / схіляе галаву пад руку Папярэдніка.

О перабольшываючы розум цуд нараджэньня ад Цябе, / Нявеста усячыстая, Маці дабраслаўлёная! / Атрымаўшы праз Цябе цалкавітае выратаваньне, / мы годна апладыруем Табе, як Дабрадзейцы, / у падарунак прыносячы песьню падзякі.

У гэты дзень Уладар / схіляе галаву пад руку Папярэдніка.

О перабольшываючы розум цуд нараджэньня ад Цябе, / Нявеста усячыстая, Маці дабраслаўлёная! / Атрымаўшы праз Цябе цалкавітае выратаваньне, / мы годна апладыруем Табе, як Дабрадзейцы, / у падарунак прыносячы песьню падзякі.

**Канон 2**

**Ірмас:** О перабольшываючы розум цуд нараджэньня ад Цябе, / Нявеста усячыстая, Маці дабраслаўлёная! / Атрымаўшы праз Цябе цалкавітае выратаваньне, / мы годна апладыруем Табе, як Дабрадзейцы, / у падарунак прыносячы песьню падзякі.

У гэты дзень Ян хрэсьціць Уладара / у бруях Ярданскіх.

У гэты дзень Уладар / водамі хавае чалавечы грэх.

Мы бачым паказанае Майсею ў цярновым кусьце / тут па небывалых законах адбыўшаеся, / калі сапраўды захаваная была вогняносьбітная Дзева, / што нарадзіла Дабрадзея, - сьвятланоснага / і ў бруях Ярдана з'явіўшагася.

У гэты дзень Уладар звыш прымае сьведчаньне, / Сын умілаваны.

У гэты дзень Уладар / прыйшоў высьвяціць водную існасьць.

палкоў / Дзеву Усячыстую Багародзіцу.

Ніякая мова не ў сілах усхваліць па годнасьці, / і нават вышэйшы сусьвету розум губляецца, - / як апяваць Цябе, Багародзіца; / але як Добрая, заклад вернасьці прымі, / бо Ты ведаеш і любоў боскую нашу, / бо Ты - Заступніца хрысьціянаў, / Цябе мы узьвялічваем.

Узьвялічвай, душа мая, / гонарам вышэйшую Нябесных палкоў / Дзеву Усячыстую Багародзіцу.

Ніякая мова не ў сілах усхваліць па годнасьці, / і нават вышэйшы сусьвету розум губляецца, - / як апяваць Цябе, Багародзіца; / але як Добрая, заклад вернасьці прымі, / бо Ты ведаеш і любоў боскую нашу, / бо Ты - Заступніца хрысьціянаў, / Цябе мы узьвялічваем.

## Песьня 9

**Канон 1**

**Ірмас:** Ніякая мова не ў сілах усхваліць па годнасьці, / і нават вышэйшы сусьвету розум губляецца, - / як апяваць Цябе, Багародзіца; / але як Добрая, заклад вернасьці прымі, / бо Ты ведаеш і любоў боскую нашу, / бо Ты - Заступніца хрысьціянаў, / Цябе мы узьвялічваем.

Узьвялічвай, душа мая, / ад Папярэдніка вадохрышча Выпрашальнага.

Узьвялічвай, душа мая, / Прыйшоўшага ў Ярдане хрост прымаць.

Давыд, прыйдзі духам да адукоўваемых і сьпявай: / “Цяпер прыступіце да Бога з верай, адукуецеся; / гэты жабрак - Адам у падзеньні - заклікаў, / і вось, прыйдучы, пачуў яго Госпад / і ў бруях Ярдана абнавіў загінуўшага!”

Узьвялічвай, душа мая, / Айца голасам Засьведчанага.

Узьвялічвай, душа мая, / Аднаго з Тройцы, прыхіліўшага галаву / і вадохрышча прыняўшага.

“Абмыйцеся і ачысьціцеся”, - абвяшчая Ісая, - / “выдаліце хітрасьць прад Госпадам; / прагнуўшыя, да вады жывой ідзіце, / бо абрасіць Хрыстос вадой абнаўленьня / з вераю да Яго зьвяртаючыхся, / і ў жыцьцё вечнае хрэсьціць Духам”.



## Кандак, тон 4

Стоячы ў бруях Ярданскіх у гэты дзень, Госпад /Яну прамаўляе: / “Не бойся ахрысьціць Мяне, / бо Я прыйшоў выратаваць Адама першароднага!”

Госпадзі, памілуй. *(сорак разоў)*

Ва усякі час і ва усялякую гадзіну прыймаючы глыбокую пашану і услаўленьне на нябёсах і на зямлі Хрысьце Божа, шматцярплячы, шматміласьцявы, усяміласэрны, любячы справядлівых і міласэрны да грэшных, усіх заклікаючы да выратаваньня абяцаньнем будучых дабротаў! Сам, Госпад, прымі ў гадзіну гэтую і нашыя малітвы і накіруй жыцьцё наша да запаведзяў Тваіх,: душы нашыя асьвяці, целы ачысьці, думкі выправі, розум ачысьці і пазбаў нас ад усякай скрухі, бед і пакуты. Абгарадзі нас сьвятымі Тваімі Анёламі, каб апалчэньнем іх захоўваемыя і скіраваныя дасягнулі мы яднаньня ў веры і разуменьня непрыступнай Тваёй славы, бо Ты дабраслаўлёны ва усі стагодзьдзя. Амін.

Госпадзі, памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Хор:** Больш годную пашаны за Хэрувімаў / і без параўнаньня больш слаўную за Сэрафімаў, / што, захаваўшы дзявоцтва, нарадзіла Бога-Слова, / існую Багародзіцу – Цябе мы ўзьвялічваем.

Імём Госпада дабраславі, ойча.

**Сьвятар:** Божа, зьлітуйся над намі і дабраславі нас; выяві нам сьвятло твару Твайго і памілуй нас.

**Чытальнік:** Амін.

**Сьвятар:** Хрысьце, Сьвятло праўдзівага, адукоўваючы і асьвячаючы усякага чалавека прыходзячага ў сусьвет! Захавай на нас сьвятло твару Твайго, ды угледзім у ім сьвятло непрыступныя, і накіруй ступні нашы да выкананьня запаведзяў Тваіх, па малітвах Усячыстай Тваёй Маці і усіх Тваіх сьвятых. Амін.

## ТРЭЦЬЦЯ ГАДЗІНА

Прыйдзеце, пакланемся Ўладару нашаму Богу.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да Хрыста, Уладара, нашага Бога.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да самога Хрыста, Уладара й Бога нашага.

### Псальма 28

Аддайце Госпаду, сыны Божыя, аддайце Госпаду славу і чту, аддайце Госпаду славу імя Ягонага; пакланецеся Госпаду ў пышнай сьвятасьці Ягонай. Голас Гасподні над водамі, Бог славы загрымеў, Гасподзь над вялікімі водамі. Голас Гасподні моцны; голас Гасподні велічны. Голас Гасподні ламае кедры; Гасподзь ламае кедры Ліванскія і прымушае іх скакаць, як цялят, Ліван і Сірыён - як маладога аднарога. Голас Гасподні выкрасае полымя вогненнае. Голас Гасподні трасе пустыню; трасе Гасподзь пустыню Кадэс. Голас Гасподні прымушае касуль кацiцца, і агаляе лясы; і ў храме Ягоным абвяшчае пра славу Ягоную. Гасподзь сядзеў над патопам, і сядзецьме Гасподзь царом вечна. Гасподзь дасьць сілу народу Свайму; Гасподзь дабраславіць народ Свой мірам.

### Псальма 41

Як сарна імкнецца да водных патокаў, так душа мая імкнецца да Цябе, Божа! Душа мая прагне Бога моцнага і жывога: калі я прыйду і зьяўлюся прад аблічча Божае! Сьлёзы мае былі мне хлебам удзень і ўначы, калі мне казалі штодзень: дзе твой Бог? Калі ўспамінаю пра гэта, душу маю выліваю, бо хадзіў я з мноствам людзей; уступаў зь імі ў храм Божы з голасам радасьці і падзякі натоўпу сьвяточнага. Чаго ты падупадаеш, душа мая, чаго непакоішся? Май надзею на Бога; бо я буду славіць Яго, Збаўцу майго і Бога майго. Падупадае ўва мне душа мая, бо я пра Цябе ўспамінаю зь зямлі Ярданскай, зь Ярмона, з гары Цаар. Бездань прорву заклікае голасам вадаспадаў Тваіх; усе воды Твае і хвалі Твае прайшлі нада мною. Удзень удзяляе Гасподзь Свае ласкі і ўночы Яму мая песьня, малітва да Бога жыцьця майго. Скажу Богу, заступніку



падаўшая расу, - / тое, што Ярдану мелася прыняць у бруі свае нярэчывы Вагонь / і зьмясьціць прамаючага хрост плоцьцю Творцу, / Якога людзі дабраслаўляюць / і узьнімаюць ва усе стагодзьдзя.

“Пакінь усякі страх, - гаварыў Збавіцель Папярэдніку, - / але падпарадкоўвайся Мне, / прыступі да Мяне, як да Хрыста, / бо Я такі па істоце, / скарыся Майму загаду і хрэсьці Мяне, сышоўшага, / Якога людзі дабраслаўляюць / і узьнімаюць ва усе стагодзьдзя!”

Калі пачуў словы Уладары Хрысьціцель, / з трапятаньнем распасьцірае руку, / але усё жа, крануўшы галаву Стваральніка свайго, / заклікаў да Хрышчаемага: / "Высьвяці мяне, бо Ты - Бог мой, / Якога людзі дабраслаўляюць / і узьнімаюць ва усе стагодзьдзя!"

Тройы з'яўленьня на Ярдане адбылося, / бо Яна - звыш-Боская Існасьць. / Айцец выгукнуў: “Гэты хрост прымаючы - Сын умілаваны Мой”, / Дух жа супрысутнічаў Роўнаму Сабе, / Якога людзі дабраслаўляюць / і узьнімаюць ва усе стагодзьдзя.

**Канон 2**

**Ірмас:** Тварэньне спазнаецца вольным, / а перш захмураныя - сынамі сьвятла; / адзін уладар цемры якоча. / Цяпер ды дабраслаўляе Віноўніка таго старанна / усіх народаў спадчына, перш няшчасная.

Трое богападобных, у вагні арашоныя, / ясна уяўлялі Найвысокую Існасьць, / усясьветла зьзяючаю траічнай сьвятыняй, / злучэньнем жа Сваім са сьмяротнай прыродай / дабражадана як бы расою спальваючы / усякую згубную памылку.

Ды апранецца ў белае уся зямная прырода / ад падзеньня узьнімаемая цяпер на неба, / бо Словам, Якім усё захоўваецца, / яна, у падаючых струменях вычышчаная, / грахоў ранейшых пазьбегла, прысьветла абмыўшыся.

*Пасьля 8 песьні “Гонарам вышэйшую за Хэрувімаў:” не сьпяваем, а сьпяваем прысьпеў сьвята:*

Узьвялічвай, душа мая, / гонарам вышэйшую Нябесных

/ дабраслаўлёны Ты!”

Як на небе, з трапятаньнем і здзіўленьнем, / на Ярдане прадстаялі хары Анёлаў, / сузіраючы гэтак дзівосную ласку Бога, - / як Ён, трымаючы горных водаў склад, / стаяў у водах носячых цела, / Бог бацькоў нашых.

Некалі воблака і мора / праволбразуя цуд боскага вадохрышча: / праз іх старажытны народ, / падарожнічаючы, хрысьціўся ў заканадаўца; / Было жа моры выявай вады, а воблака - Духу; / імі атрымоўваючы пасьвячэньня, мы заклікаем: / “Дабраслаўлёны Ты, Божа, бацькоў нашых!”

Усе мы, праваслаўныя, богасловя / аб Тым, ад Каго атрымалі дасканаласьць, / будзем з Анёламі не змаўкаючы славіць / Айца, Сына і Сьвятога Духа, / бо гэта Тройца адзінасутных Асобаў, / але адзіны Бог, Якому і сьпяваем: / “Госпад і Бог бацькоў, дабраслаўлёны Ты!”

**Канон 2**

**Ірмас:** Папаліўшы галовы зьмеяў струменем / Утаймаваўшы печы высокае полымя, / ахапіўшая юнакоў набожных; / а нязручнаачышчаемую імглу граху / Ён усю абмывае расою Духа.

Паказаўшая Цябе Асірыйскае жудаснае полымя, / Ты спыняеш, у расу ператвараючы; / так і цяпер Хрысьце, Ты апрануўся вадою, / папаляя патаемнага лютага драпежніка, / адхіляючага нас на сьлізкі шлях.

У старажытнасьці па падзеле Ярдана / народ Ізраільскі пераходзіць па сушы, / правобразуючы Цябе, Усямоцнага, / цяпер тварэньне ў бруях імклівa / выносячага да нязьменнага і лепшага шляху.

Ведаем, што Ты перш патоп усязгубны / жаласным чынам навёў да зьнішчэньня усіх, / о Здзяйсьняючы найвялікшае і дзівоснае; / цяпер жа, Хрысьце, Ты грэх патапіў / па міласэрнасьці дзеля выратаваньні сьмяротных.

## Песьня 8

**Канон 1**

**Ірмас:** Паказала таемніцу незвычайную / Вавілонская печ,



майму: навошта забыў Ты мяне? Навошта хаджу я і бядую ад варожых зьнявагаў? Быццам косьці ламаюць мае, збыткуюць зь мяне мае супастаты, калі кажуць мне кожнага дня: дзе твой Бог? Чаго ж ты журышся, душа мая, чаго ты маркоцішся? май надзею на Бога; бо я буду славіць Яго, Збаўцу майго і Бога майго.

## Псальма 50

Зьлітуйся, Божа, зь мяне ў вялікай ласцы Тваёй, і ў мностве шчадротаў Тваіх загладзь беззаконьні мае! Адмый мяне шматкроць ад беззаконьня майго, і ад грэху майго ачысьці мяне: бо беззаконьне маё я ўсьведамляю, і грэх мой заўсёды перада мною. Табе, Табе аднаму я зграшыў і прад вачыма Тваімі благое ўчыніў: таму справядлівы Ты будзеш у прысудзе Тваім, і чысты ў судзе Тваім. Вось, я ў беззаконьні зачаты, і ў грэху маці мая нарадзіла мяне. Вось, палюбіў Ты праўду ў сэрцы і ўліў у мяне тайную мудрасьць. Акрапі мяне ісопам, і ачышчуся: абмый мяне, і бялей за сьнег адбялюся. Дай мне ўцеху пачуць і радасьць, і ўзрадуюцца косьці, Табою паламаныя. Адвярні аблічча Тваё ад грахоў маіх і загладзь усе беззаконьні мае. Чыстае сэрца ўмацуй ува мне, Божа, і дух справядлівы аднаві ўва мне. Не адкінь мяне ад аблічча Твайго і Духа Твайго Сьвятога не адбірай у мяне. Вярні мне радасьць збаўеньня Твайго, і Духам Уладным мяне падтрымай. Я навучу беззаконцаў дарогам Тваім, і бязбожныя да Цябе навернуцца. Вызваль мяне ад крывавасьці, Божа, Божа ратунку майго; і язык мой уславіць праўду Тваю. Госпадзе! адкрый вусны мае, і вусны мае прагалосяць славу Табе: бо калі б ахвяры Ты пажадаў, я даў бы яе; цэласпаленьне Табе не падабаецца. Ахвяра Богу - дух упакораны; сэрца ўпакоранае і зьміранае Бог ня зьнішчае. Ушчасьліві, Госпадзе, добрай воляй Тваёю Сіён, і хай паўстануць муры Ерусалімскія. Тады ўпадабаеш Ты ахвяру праўды, прынашэньні і цэласпаленьні; тады пакладуць на алтар Твой цялят.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і ўвесь час, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя, слава Табе, Божа. *(тры разы)*

Госпадзі, памілуй. *(тры разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Трапар, тон 4**

Назад пацякла некалі Ярдан-рака / ад дабрыні Ялісея па ушэсьці Ільлі, / і падзяляліся воды туды і сюды, / і стаў дзеля яго сухім шлях па вільгаці, / як правобраз праўдзівы вадохрышча, / якім мы пераходзім шлях цякучага жыцьця. / Хрыстос з'явіўся ў Ярдане, асьвячаючы воды.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны:** Багародзіца, Ты - Лаза праўдзівая, / узрасьціўшая нам жыцьця Плод; / Цябе умольваем: маліся, Уладарка / з Апосталамі і усімі сьвятымі / аб памілаваньні душаў нашых.

**Вершыры трэцьцяй гадзіны, тон 8**

У Папярэдніка і Хрысьціцеля, прарока, / і шаноўнага вышэй усіх пракрокаў, / завагалася цяпер правае рука, / калі убачыў ён Цябе, Агнца Боскага, / ачышчаючага сусьвету грахі; / і, змаганьням абхоплены, ён заклікаў: / “Не адважваюся дакрануцца да галавы Тваёй, Слова, / Сам мяне асьвяці і адукуй, Міласэрны, / бо Ты - жыцьцё, і сьвятло, і сьвет сусьвету!” *(2)*

**Верш:** Бо я пра Цябе ўспамінаю зь зямлі Ярданскай, зь Ярмона**.**

**Пс 41:7б**

Тройца, Бог наш, / Самога Сябе нам у гэты дзень непадзельным явіў: / бо Айцец ясным сьведчаньнем прывітаў Роднага Сабе, / Дух у выяве голуба зьляцеў з нябёсаў, / Сын прачысты галаву Сваю перад Папярэднікам схіліў / і, хрысьціўшыся, пазбавіў чалавецтва ад рабства, / як Чалавекалюбчы.

**Верш:** Бачылі Цябе, Божа, воды, / бачылі Цябе воды, і напалохаліся**.**

**Пс 76:17а**

Тройца, Бог наш, / Самога Сябе нам у гэты дзень непадзельным явіў: / бо Айцец ясным сьведчаньнем прывітаў



і не прызнаючым Яго Богам, / а ў Духу вадою дабрадатна абнаўляе / вызнаючых Яго Боскасьць, / ад грахоў іх пазбаўляючы.

**Канон 2**

**Ірмас:** Айцец явіў усярадасным голасам / Жаданага, Якога вырабіў Ён з улоньня: / “Сапраўды, гаворыць, Гэты, Хто з'яўляецца Сынам / адзінай са Мною прыроды, / прамяністы, выйшаў з роду людскага, / жывое Слова Маё і разам - сьмяротны, па дабраваленьню!”

Ад льва марскога на трэці вечар / Прарок, дзіўным чынам усярэдзіне яго прабываўшы, / зноў выйшаў, усім прадвесьцячы / выратаваньне ад зьмея-чалавеказабойцы / пасрэдніцтвам адраджэньня ў апошнюю пару.

Калі адчыніліся празрыстыя стэлі нябёсныя, / бачыць таемнаглядач ад Айца сыходзячага / і знаходзіўшагася на Слове усячыстам / Духа, як голуб сышоўшага нятлумачальным чынам, / і паказвае натоўпам прыходзіць да Уладара.

**Кандак, тон 4**

З'явіўся Ты ў гэты дзень сусьвету, / і сьвятло Твае, Госпад, захаваўся на нас, / у поўнасьці веданьня асьпяваючых Цябе: / “Прыйшоў, з'явіўся Ты, / Сьвятло непрыступнае!”

**Ікас:** Галілеі паганскай, Завуланавай краіне і Няфалімавай зямлі, / як сказаў прарок, зазьзяла сьвятло вялікая - Хрыстос. / З'явілася азмрочаным сьветлае зьзяньне, / з Віфляема, або, дакладней, ад Марыі, зьзяючая: / Госпад, Сонца праўды, промні пасылае усёй сусьвету. / Таму тыя, хто ад Адама, голыя, / прыйдзіце усё, апранёмся ў Яго, каб сагрэцца, / бо Ён - покрыва голым і зьзяньне азмрочаным. / Прыйшоў, з'явіўся Ты, / Сьвятло непрыступнае!

**Песьня 7**

**Канон 1**

**Ірмас:** Юнакоў набожных, / у печы вогненай знаходзячыхся, / шумны вецер з расою цэлымі захаваў / і Анёла Боскага спасланьне; / таму абрашаныя сярод полымя, / яны з падзякай сьпявалі: / “Усяхвальны Госпад і Бог бацькоў,

Калі незьлічоныя натоўпы сыйшліся / ад Яна хрысьціцеся, / ён стаў пасярод іх і зьвяртаўся да прысутных: / “Хто, непакорлівыя, вас навучыў / ухіляцца ад гневу будучыні? / Прыносіце Хрысту годны плод; / бо з'яўляючыся цяпер, Ён мір падае!”

Земляроб і Стваральнік, стаўшы пасярод, / як адзін з усіх, уваходзіць у сэрцы, / і узяўшы ў рукі веяцельную рыдлёўку дзеля ачышчэньня, / прамудра падзел ажыцьцяўляе на сусьветным гумне, / бясплоднасьць спальваючы, а пладаносным / жыцьцё вечная падаючы.

**Канон 2**

**Ірмас:** Ад яду цёмнага і апаганенага ворага / амытыя Духу ачышчэньнем, / мы усталі на прамы новы шлях, / да недасягальнай радасьці вядучы, / даступнай толькі дзеля прыміраных з Богам.

Стваральнік, бачачы ў цямрэчы грахоў, / у непарыўнай сувязі таго, / каму дае выяву пальцамі, / падняўшы, кладзе яго на плечы, / абмываючы цяпер у шматводных безданях / ад старажытнай ганьбы хваробы Адамавай.

З глыбокай павагай старанна зьвернемся / да чыстых крыніц выратавальнага струменя, / сузіраючы Слова, ад Бязгрэшнай увасобішаяся, / падаючае кубак, насычаючы смагу боскага, / вылекоўваючага дабратворна сусьвету хваробу.

## Песьня 6

**Канон 1**

**Ірмас:** Тон Слова, сьвяцільнік Сьвятла, / ранішняя зорка - Папярэднік Сонца / заклікае ў пустэльні усім людзям: / “Кайцеся і загадзя чысьціцеся, / бо вось маецца быць Хрыстос, / сусьвет ад згубы пазбаўляючы!”

Хрыстос, чый рамень - злучэньне Слова / з тым, што ад нас было прынята Ім, - / як вучыць Папярэднік, разьвязаць немагчыма, / ад Бога і Айца народжаны не па законах зямным, / ад Дзевы без брыдоты увасабляецца, / народжаных на зямлі ад памылкі пазбаўляючы.

У вагні канчатковым хрост дае Хрыстос не скараючымся /



Роднага Сабе, / Дух у выяве голуба зьляцеў з нябёсаў, / Сын прачысты галаву Сваю перад Папярэднікам схіліў / і, хрысьціўшыся, пазбавіў чалавецтва ад рабства, / як Чалавекалюбчы.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Тон 5:** Ідучы ў целе да Ярдана, Госпад, / жадаў Ты хрост прыняць ў выяве чалавека, Падавец жыцьця, / каб па Сваёй Літасьці нас, заблукаўшых, / пазбавіўшы ад усялякіх спакусаў і сеткі зьмея, асьвяціць. / Тады Ты прыняў ад Айца сьведчаньне, / Боскі ж Дух у выглядзе голуба Табе з'явіўся; / але усяліся ў душы нашы, Чалавекалюбчы!

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ідучы ў целе да Ярдана, Госпад, / жадаў Ты хрост прыняць ў выяве чалавека, Падавец жыцьця, / каб па Сваёй Літасьці нас, заблукаўшых, / пазбавіўшы ад усялякіх спакусаў і сеткі зьмея, асьвяціць. / Тады Ты прыняў ад Айца сьведчаньне, / Боскі ж Дух у выглядзе голуба Табе з'явіўся; / але усяліся ў душы нашы, Чалавекалюбчы!

## Пракімен, тон 6

Бачылі Цябе, Божа, воды, бачылі Цябе воды, і напалохаліся.

**Верш:** Голас мой да Бога, і я буду клікаць; голас мой да Бога, і Ён пачуе мяне.

**Пс 76:17а, 2**

## Прароцтваў Ісаі чытаньня.

Абмыйцеся, ачысьціцеся; адвядзеце ліхія ўчынкі вашыя ад вачэй Маіх; перастаньце рабіць зло; навучэцеся рабіць дабро; шукайце праўды; ратуйце прыгнечанага; абараняйце сірату; заступайцеся за ўдаву. Тады прыйдзеце, і рассудзім, кажа Гасподзь. Калі будуць грахі вашыя, як барвовае, - як сьнег адбялю; калі будуць чырвоныя, як пурпура, - як воўну адбялю. Калі захочаце і паслухаецеся, дык есьцімеце даброты зямлі. Калі ж адмовіцеся і будзеце ўпарціцца, дык меч зжарэ вас: бо вусны Гасподнія маўляюць.

**Іс 1:16 – 20**

*Дзеі сьвятых Апосталаў, пачатак 42.*

*Евангельля ад Марка, пачатак 1.*

Дабраславёны Бог кожны дзень, Бог ускладае на нас цяжар, але Ён і ратуе нас. Бог нам - Бог на ратаваньне; ва ўладзе Госпада Ўладыкі брама сьмерці.

**Пс 67:20, 21**

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Усясьвятая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе, памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Твае, прыдзі ўладарства Твае, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзёнага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё ёсьць валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Чытальнік:** Амін.

### Кандак, тон 4

Стоячы ў бруях Ярданскіх у гэты дзень, Госпад /Яну прамаўляе: / “Не бойся ахрысьціць Мяне, / бо Я прыйшоў выратаваць Адама першароднага!”

Госпадзі, памілуй. *(сорак разоў)*

Ва усякі час і ва усялякую гадзіну прыймаючы глыбокую пашану і услаўленьне на нябёсах і на зямлі Хрысьце Божа, шматцярплячы, шматміласьцявы, усяміласэрны, любячы справядлівых і міласэрны да грэшных, усіх заклікаючы да выратаваньня абяцаньнем будучых дабротаў! Сам, Госпад, прымі ў гадзіну гэтую і нашыя малітвы і накіруй жыцьцё



“Выявіў боганатхнённую усяшану, якая яго напоўніла, / пры сустрэчы з Табою Майсей: / бо калі ён зразумеў, што Ты выгукнуў з цярновага куста, / вочы свае адразу адвёў; / як жа я вольна зірну на Цябе, / альбо як руку на Цябе ускладу? / Бо Ты - Хрыстос, Боская мудрасьць і моц!”

“Душу разумную маючы і дарам слова ушанаваны, / асьцерагаюся я неадушаўлёных рэчаў: / бо калі хрышчу я Цябе, мне выкрывальнікам будзе / гара, дымлівая ад вагню, / і мора, падзеленая напалам, / і гэты Ярдан, зьвернуты назад, / бо Ты - Хрыстос, Боская мудрасьць і моц!”

**Канон 2**

**Ірмас:** Вычышчаны агнём таямнічага бачаньня, / прарок, апяючы сьмяротных абнаўленьне, / у Духу узвышае прамову з воплескам, / адчыняючыя увасабленьне Слова невымоўнага, / Якім уладароў моц праможана.

Пасланае ад Айца усясьветлае Слова! / Ты прыйшоў разагнаць ночы згубную цямрэчу, / з коранем грэх сьмяротных зьнішчыць, / і вывесьці разам з Собой вадохрышчам Тваім, Дабрашчасны, / сьветлых сыноў з бруй Ярданскіх.

Угледзеўшы Само усяслаўнае Слова, / прадвесьнік вольна заклікае да тварэньня: / “Гэты, перш мяне Наяўны, пасьля мяне прыняў цела, / з намі падобны зазьзяў сілай Боскай, / каб вынішчыць наш усянянавісны грэх!”

Да самага лугу жыватворнаму нас прыводзячы, / пачынае паляваньне Бог-Слова, / нападаючы на логавішчы зьмеяў, / зьнішчыўшы кругі сьценаў непрыступных / і увесь род чалавечы ў пяту ураджаны; / злучаючы яго, Ён ратуе тварэньне.

### Песьня 5

**Канон 1**

**Ірмас:** Ісус, Начальнік жыцьця, прыходзіць адмяніць / асуджэньне Адама першароднага, / і як Бог, не патрабуючыся ў ачышчэньні, / дзеля распуснага абмываецца ў Ярдане, / у якім забіўшы варожасьць, / праўзыходзячы усялякі розум мір падае.

наш / і няма справядлівага, акрамя Цябе, Госпад!”.

Гучным голасам у пустэльні заклікае Папярэднік: / “Хрысту прыгатуйце шляхі / і шляху Богу нашаму прамымі зрабіце, / з вераю усклічучы: / "Няма сьвятога, як Бог наш / і няма справядлівага, акрамя Цябе, Госпад!”.

**Канон 2**

**Ірмас:** Усе мы, вызваліўшыся ад старажытных цянёт, / разбураных цяпер сківіц пражэрлівых львоў, / усьцешымся і адчынім вусны, / Слову песьню сплятаючы з слоў, / што з падарункаў, дадзеных нам, - найболей радасны.

Той, хто першапачаткова насадзіў сьмяротнасьць у тварэньні, / паўстаўшы ў выглядзе шкоднага гада, / азмрочваецца прышэсьцем у целе Уладары, / сапхнуўшыся з Ім, як з сьвітанкам, з'явіўшымся / зьнішчыць яго вароджую галаву.

Вабіць Уладар да Сабе існасьць богастворaную, / пахаваную усярэдзіне чэрава ката, / і ізноў нараджае яе, / аднаўленьнем роду зямнога / завяршаючы Сваю найвялікшую справу; / бо Ён прыйшоў, жадаючы яе абараніць.

### Іпакой, тон 5

Калі з'явай Тваёй Ты усё адукаваў, / тады салёнае мора няверы пабегла, / і Ярдан, уніз бягучы павярнуўся, / да нябёсаў узвышаючы нас. / Але вышынёю Боскіх запаветаў Тваіх, Хрысьце Божа, / захавай па малітвах Багародзіцы і памілуй нас.

### Песьня 4

**Канон 1**

**Ірмас:** Пачуў я, Госпадзі, голас Твой, / які назваў Ты голасам клікаючага ў пустэльні: / калі апавясьціў Ты над водамі шматлікімі, / аб Тваім сьведчачы Сыне, / увесь напоўнены з'явіўшымся Духам, ён выклікнуў: / “Ты - Хрыстос, Боская мудрасьць і моц!”

“Ці бачыў хто, - прадвесьнік заклікае, - / каб чысьцілі сонца, сьветлае па існасьці? / Як жа мне водамі абмыць Цябе, / выпраменьваньне Славы, адбітак вечнага Айца? / І як я, трава, дакрануся / да вагню Тваёй Боскасьці? / Бо Ты - Хрыстос, Боская мудрасьць і моц!”



наша да запаведзяў Тваіх,: душы нашыя асьвяці, целы ачысьці, думкі выправі, розум ачысьці і пазбаў нас ад усякай скрухі, бед і пакуты. Абгарадзі нас сьвятымі Тваімі Анёламі, каб апалчэньнем іх захоўваемыя і скіраваныя дасягнулі мы яднаньня ў веры і разуменьня непрыступнай Тваёй славы, бо Ты дабраслаўлёны ва усі стагодзьдзя. Амін.

Госпадзі, памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

**Хор:** Больш годную пашаны за Хэрувімаў / і без параўнаньня больш слаўную за Сэрафімаў, / што, захаваўшы дзявоцтва, нарадзіла Бога-Слова, / існую Богародзіцу – Цябе мы ўзьвялічваем.

Імём Госпада дабраславі, ойча.

**Сьвятар:** Божа, зьлітуйся над намі і дабраславі нас; выяві нам сьвятло твару Твайго і памілуй нас.

**Чытальнік:** Амін.

### Малітва сьвятога Мардарыя

Уладар Божа, Ойча Усётрымаючы, Госпад, Сын Адзінародны Ісус Хрыстос і Дух Сьвятой! Адзіная Боскасьць, адзіная Сіла, памілуй мяне, грэшнага, і Табе вядомымі шляхамі выратуй мяне, нявартага слугу Твайго, бо Ты благословен у павекі стагоддзяў. Амін.

## ШОСТАЯ ГАДЗІНА

Прыйдзеце, пакланемся Ўладару нашаму Богу.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да Хрыста, Уладара, нашага Бога.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да самога Хрыста, Уладара й Бога нашага.

### Псальма 73

Навошта, Божа, назаўсёды Ты нас адкінуў? распаліўся Твой гнеў на авечак пашаў Тваіх? Успомні пра збор Твой, які Ты прыдбаў здавён, пра племя спадчыны Тваёй, якое Ты адкупіў, - пра гэту гару Сіён, на якой Ты пасяліўся. Падымі Твае ногі да

вечных руінаў: усё вораг разбурыў у сьвятыні. Рыкаюць ворагі Твае сярод сходаў Тваіх, паставілі знакі свае замест нашых азнакаў; выдавалі сябе падобнымі на таго, хто падымаў сякеру на перавітае вецьце дрэва; і сёньня ўсе рэзьбы ў ім адным разам разьбілі яны сякерамі і бярдышамі; сьвятыню Тваю на вагонь аддалі, сялібу Твайго імя дашчэнту заплямілі; сказалі ў сэрцы сваім: "зруйнуем іх зусім!" - і спалілі ўсе мясьціны Божых сходаў на зямлі. Азнакаў нашых мы ня бачым, няма больш прарока, і няма з намі таго, хто ведаў бы, дакуль гэта будзе. Дакуль, Божа, вораг зьдзек чыніць будзе? ці вечна будзе агуднік імя Тваё ганіць? Навошта ўхіляеш руку Тваю і правіцу Тваю? Зь сярэдзіны ўлоньня Твайго іх панішчы. Божа, Цару мой адвеку, Ты чыніш ратаваньне пасярод зямлі! Ты разьдзяліў сілаю Тваёю мора, Ты патрушчыў галовы зьмеям на водах; Ты струшчыў галаву левіяфану, аддаў яго на ежу народу ў пустыні. Ты выкрасаў паток і крыніцу, Ты высушыў рэкі вялікія. Твой дзень і Твая ноч; падрыхтаваў Ты сьвяцілы і сонца; Ты правёў усе межы зямлі, лета і зіму Ты ўтварыў. Прыгадай жа: вораг Госпада зьневажае, і неразумныя людзі ганяць імя Тваё. Не аддай зьвярам душы Тваёй галубіцы; сходаў убогіх Тваіх не забудзь назаўсёды. Дагледзь запавет Твой, бо цямноты зямлі поўныя жытлішчамі гвалту. Хай ня вернецца прыгнечаны ў сораме; гаротны і ўбогі хай славяць імя Тваё. Паўстань, Божа, абарані дзеі Твае, успомні штодзённае зьневажаньне Цябе неразумнымі; не забудзь крыкаў ворагаў Тваіх; шум паўсталых супроць Цябе ўвесь час падымаецца.

## Псальма 76

Голас мой да Бога, і я буду клікаць; голас мой да Бога, і Ён пачуе мяне. У дзень скрухі маёй шукаю Госпада; рука мая працягнута ўначы, і не апускаецца; душа мая ня хоча суцешанай быць. Пра Бога згадваю, і дрыжу; разважаю, і зьнемагае мой дух. Ты не даеш мне вачэй маіх зьмежыць; я ашаломлены, і не магу гаварыць. Разважаю пра даўнія дні, пра гады пракаветныя; узгадваю песьні мае начныя, гутару з сэрцам маім, і выпрабоўвае дух мой: няўжо назаўсёды адкінуў, Гасподзь, і ня



людзей вядзе, / пакрыўшы ў ёй супернікаў, / моцны ў бітвах Госпад, / бо Ён уславіўся.

Адама загінулага узнаўляе / бруямі Ярдана / і галовы зьмеяў, перабываючых там руйнуе / Цар стагодзьдзяў - Госпад, / бо Ён уславіўся.

Вагонь Боскі нярэчывы / у рэчывая цела Апрануўшыся / бруёю Ярдана апранаецца, - / увасобіўшыся ад Дзевы Госпад, / бо Ён уславіўся.

Госпад, амыўшы бруд людзей, / прыняўшы ачышчэньне ў Ярдане / дзеля тых, якім Ён пажадаў прыпадобніцца, / застаўшыся тым, чым быў, / асьвячая перабываючых у цямрэчы, / бо Ён уславіўся.

**Канон 2**

**Ірмас:** Ізраіль праходзіць хвалямі калыхаючаяся мора, / якое апынулася раптам сушаю, / а егіпецкіх вершнікаў бездань змрочная / цалкам пакрыла, як водная магіла, / моцнаю сілаю правіцы Уладара.

Цяпер сьмяротным з'явілася сьвятланосная раніца / ад пустэльні ў бруях Ярдана: / Ты, Цар сонца, схіліў Сваю шыю, / каб вызваліць родапачынальніка нашага з змрочнай краіны / і ад усякай брыдоты ачысьціць тварэньне.

Безпачатковае Слова! Згубленага памылкай / Ты новым робіш, хаваючы з Сабой ў струменях, / незвычайна прыняўшы ад Айца / такое наймоцнае слова: / "Гэты умілаваны і роўны Мне існасьцю, / Сынам Маім мянуецца!"

## Песьня 3

**Канон 1**

**Ірмас:** Госпад, падаючы крэпасьць нашым царам / і узьвялічваючы годнасьць памазанікаў Сваіх, / нараджаецца ад Дзевы і прыходзіць дзеля вадохрышча. / Таму мы, верныя, сьпяваем: / "Няма сьвятога, як Бог наш, / і няма справядлівага, акрамя Цябе, Госпад!"

Бясплодная і цалкам бяздзетная раней, / радуйся цяпер, Царква Хрыстова, / бо вадою і Духам сыны ў цябе нарадзіліся, / з募 верою сьпяваючы: / "Няма сьвятога, як Бог

клікаючага ў пустэльні, / і убачым там Стваральніка Адама, / на Якога, па міласэрнасьці Яго незвычайнай, / ускладае руку слуга. / І да Яго голасна паклічам: / "Ты прыйшоў і з'явіўся ў Ярдане, / асьвячаючы воды!"

*Сьцепяны, 1-й аціфон 4-га тону.*

**Пракімен, тон 4**

Мора ўгледзела, і пабегла; / Ярдан павярнуўся назад.

**Верш:** Што з табою, мора, чаго ты пабегла, і з табою, Ярдане, чаго павярнуўся назад?

**Пс 113:3, 5**

*Евангельля ад Марка, пачатак 2.*

**Пасьля 50 псальмы вершыра**

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Тон 2:** Усё сёньня ўзрадуецца: / Хрыстос з'явіўся на Ярдане.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін

**Тон 2:** Усё сёньня ўзрадуецца: / Хрыстос з'явіўся на Ярдане.

**Вершыра, тон 6**

Бог Слова з'явіўся ў целе роду чалавечаму. / У Ярдане Ён стаяў, рыхтуючыся прыняць вадохрышча, / і гаварыў Яму Папярэднік: / "Як працягну я руку / і крану галаву Таго, хто трымае усё? / Хоць Ты і Немаўля ад Марыі, / але я ведаю Цябе, Бога прадвечнага. / Па зямлі Ты ідзеш, асьпяваямы Сэрафімамі, / і я, слуга, не навучыўся яшчэ хрысьціць Уладара". / Неспасьціжны Госпад, слава Табе!

**Каноны**

*Першы - св. Косьмы Маіўмскага, тон 2, і другі - св. Яна Дамаскіна, тон 2; ірмасы абодвух канонаў выконваюцца двойчы, трапары сьпяваем на 12. Катавасія: ірмасы першага і другога канону.*

**Песьня 1**

**Канон 1**

**Ірмас:** Агаліў дно бездані марской / і па сушы Сваіх



будзе больш дабраволіць? няўжо назаўсёды міласьць Яго перастала быць, і спынілася слова Ягонае з роду ў род? няўжо Бог забыўся мілаваць? няўжо ў гневе спыніў шчадроты Свае? І сказаў я: вось гора маё - перамена правіцы Ўсявышняга. Буду ўспамінаць пра дзеі Гасподнія! буду ўспамінаць пра даўнія цуды Твае. Буду ў кожны Твой чын заглыбляцца, разважаць пра вялікія дзеі Твае. Божа! сьвятая дарога Твая. Які Бог такі вялікі, як Бог наш! Ты - Бог, Які творыць цуды; Ты паказаў магутнасьць Сваю сярод народаў; Ты вызваліў народ Твой рукою сыноў Якава і Язэпа. Бачылі Цябе, Божа, воды, бачылі Цябе воды, і напалохаліся, і скалануліся бездані. Аблокі вылівалі воды, хмары аддавалі гром, і лёталі стрэлы Твае. Голас грому Твайго ў коле нябесным; маланкі асьвятлялі сьвет; зямля трэслася і скаланалася. Шлях Твой у моры, і сьцежка Твая ў водах вялікіх, і сьляды Твае невядомыя. Як статак, вёў Ты народ Твой рукою Майсея і Аарона.

**Псальма 90**

Хто жыве пад аслонаю Ўсявышняга, той пакоіцца ў засені Ўсемагутнага, кажа Госпаду: прыстанішча мне і Заступніку мой, Божа мой, на Цябе спадзяюся! Ён цябе вызваліць зь сетак лаўца, ад пагібельнай пошасьці; пер'ем Сваім Ён цябе ўзасьціць, і пад крыльлем ягоным убясьпечышся; шчыт і аслона - ісьціна Ягоная. Не збаішся страху начнога, ні стралы, што ўдзень пралятае, ні пошасьці, што ў цемры ходзіць, ані пошасьці, што нішчыць апоўдні. Упадзе тысяча побач з табою, і дзесяць тысяч праваруч ад цябе; але да цябе не наблізіцца: толькі глядзецьмеш вачыма тваімі і ўбачыш помсту бязбожнікам. Бо сказаў Ты: Гасподзь - надзея мая; Усявышняга выбраў ты прыстанішчам тваім; ліха цябе не спаткае, і пошасьць жытла твайго не зачэпіць; бо анёлам Сваім наказвае пра цябе - ахоўваць цябе на ўсіх дарогах тваіх, і на руках цябе панясуць, каб не спатыкнуўся ты аб камень нагою тваёю; на асьпіда і васіліска наступіш і патопчаш ільва і дракона. "За тое, што ён палюбіў Мяне, уратую яго; абараню яго, бо ён спазнаў імя Маё. Пакліча Мяне і пачую яго: зь ім Я ў жалобе, вызвалю яго, і праслаўлю яго; даўжынёю

дзён напоўню яго, і пакажу яму выратаваньне Маё".

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя, слава Табе, Божа. *(тры разы)*

Госпадзі, памілуй. *(тры разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

## Трапар, тон 4

Назад пацякла некалі Ярдан-рака / ад дабрыні Ялісея па ушэсьці Ільлі, / і падзяляліся воды туды і сюды, / і стаў дзеля яго сухім шлях па вільгаці, / як правобраз праўдзівы вадохрышча, / якім мы пераходзім шлях цякучага жыцьця. / Хрыстос з'явіўся ў Ярдане, асьвячаючы воды.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Богародзічны:** Няма ў нас адвагі з-за мноствы грахоў нашых, / але Ты умалі ад Цябе Народжанага, Богародзіца Дзева! / Бо сілу усямоцную мае маленьня Маці да добразычлівага Уладара. / Не пагрэбуй маленьнямі грэшных, Усячыстая, / бо міласьцівы і мае сілу ратаваць / Той, Хто прыняў за нас пакуты.

## Вершыры шостай гадзіны, тон 8

Так гаворыць Госпад Яну: / "Прарок, хутчэй хрэсьці Мяне, цябе стварыўшага, / і адукуючага дабрынёй, / і ачышчальніка усіх. / Краніся Боскай Маёй галавы і не усумніся. / Прарок, дапусьці зараз, / бо Я прыйшоў выканаць праўду усякую. / Так што ты не сумнявайся ні ў чым, / бо хаваючагася ў водах непрыяцеля, / князя цемры, сьпяшаюся Я зьнішчыць, / пазбаўляючы цяпер сьвет ад яго сетак, / падаючы як Чалавекалюбчы жыцьцё вечнае!" *(2)*

**Верш:** Бо я пра Цябе ўспамінаю / зь зямлі Ярданскай, зь Ярмона.

**Пс 41:7б**

У гэты дзень псальмаў прароцва / атрымаць выкананьне сьпяшаецца. / Бо мора, як абвяшчаюць яны, убачыла і пабегла, / Ярдан жа зьвярнуўся назад / ад твару Госпада, ад твару Бога Якава, / прыйшоўшага ад слугі прыняць вадохрышча, / каб мы, ад бруду паганскага служэньня



Гасподзь над вялікімі водамі.

**Пс 28:3в**

Узвышаюць рэкі, Госпадзе, узвышаюць рэкі голас свой

**Пс 92:3а**

Але над шумам водаў вялікіх.

**Пс 92:4а**

Бо я пра Цябе ўспамінаю зь зямлі Ярданскай, зь Ярмона.

**Пс 41:7б**

Бо ў Табе крыніца жыцьця; у сьвятле Тваім мы бачым сьвятло.

**Пс 35:10**

Мора ўгледзела, і пабегла; Ярдан павярнуўся назад.

**Пс 113:3**

Ты разьдзяліў сілаю Тваёю мора.

**Пс 73:13а**

Ты патрушчыў галовы зьмеям на водах.

**Пс 73:13б**

Ты выкрасаў паток і крыніцу.

**Пс 73:15а**

Бачылі Цябе, Божа, воды, бачылі Цябе воды, і напалохаліся.

**Пс 76:17а**

Шлях Твой у моры, і сьцежка Твая ў водах вялікіх.

**Пс 76:20а**

Як многа дзеяў Тваіх, Госпадзе! Усё стварыў Ты мудра.

**Пс 103:24а**

## Пасьля паліялея сядальны, тон 4

Прыйдзіце, верныя, убачым дзе хрысьціўся Хрыстос; / рушым усьлед жа далей да Ярдана-ракі, / да голасу клікаючага ў пустэльні, / і убачым там Стваральніка Адама, / на Якога, па міласэрнасьці Яго незвычайнай, / ускладае руку слуга. / І да Яго голасна паклічам: / "Ты прыйшоў і з'явіўся ў Ярдане, / асьвячаючы воды!"

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Прыйдзіце, верныя, убачым дзе хрысьціўся Хрыстос; / рушым усьлед жа далей да Ярдана-ракі, / да голасу

Дух жа Сьвяты на Цябе сыходзіў, / і мы, Ім асьвечаныя, заклікаем: / “Слава Богу, Існаму ў Тройцы! ”

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 4:** Высьвяціў Ты бруі Ярданскія, / зьнішчыў магутнасьць граху, Хрысьце Божа наш. / Схіліўся пад рукой Папярэднікі / і выратаваў ад памылкі чалавечы род. / Таму мы умольваем Цябе: / “Выратуй сусьвет Твой!”

**Па 2 вершаслоўі сядальны, тон 5**

Апранаючаеся усяслаўна сьвятлом Слова Боскага, / Ты, пагрузіўшыся ў бруі Ярданскія, / абнавіў у іх Адамава існасьць, / разбураную злым непаслушэнствам. / Таму мы Цябе усхваляем / і усё усхваляем Тваё сьвятое з'яўленьня.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 4:** Што убачыла Ты і жахнулася, Ярдан-рака? / “Нябачнага, - гаворыць яна, - я угледзела голым і затрымцела, / бо як мне Яго не застрашыцца і не схавацца?” / Анёлы застрашыліся, бачачы Яго, / жахнулася неба і зямля затрымцела, / зьмірылася моры і усё бачнае і нябачнае: / Хрыстос з'явіўся на Ярдане, асьвячаючы воды.

**Узвялічваньня**

Узьвялічваем Цябе, / Падавец жыцьця Хрысьце, / дзеля нас цяпер плоцьцю прыняўшага / ад Яна ў водах Ярданскіх.

**Псальма абраная**

Божа! будзь літасьцівы да нас і дабраславі нас.

**Пс 66:2а**

Асьвятлі нас абліччам Сваім.

**Пс 66:2б**

Хто прыглядваўся да Яго, тыя прасьвятліліся, і твары іхнія ня зьведаюць сораму.

**Пс 33:6**

Рачныя патокі весяляць горад Божы.

**Пс 45:5а**

Голас Гасподні над водамі.

**Пс 28:3а**



амытыя, / адукаваліся душамі праз Яго.

**Верш:** Бачылі Цябе, Божа, воды, / бачылі Цябе воды, і напалохаліся.

**Пс 76:17а**

У гэты дзень псальмаў прароцва / атрымаць выкананьне сьпяшаецца. / Бо мора, як абвяшчаюць яны, убачыла і пабегла, / Ярдан жа зьвярнуўся назад / ад твару Госпада, ад твару Бога Якава, / прыйшоўшага ад слугі прыняць вадохрышча, / каб мы, ад бруду паганскага служэньня амытыя, / адукаваліся душамі праз Яго.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Тон 5:** Што утрымліваеш свае воды, о Ярдан? / Што вяртаеш бруі, / і не працягваеш звычайнай плыні? / "Не магу я , - гаворыць ён, - вынесьці / Агню, зьнішчаючага мяне. / Дзіўлюся і трымчу прад крайняй ласкай: / бо не звык я Чыстага абмываць, / няўмею Бязгрэшнага абціраць, / але толькі апаганеныя пасудзіны чысьціць. / Спальваць цернаў грахоў мяне вучыць / ва мне хрост прымаючы Хрыстос. / Ян сьведчыць са мною, ён, голас Слова, і заклікае: / “Вось Ягня Боская, прымаючая грэх сусьвету!” / Яму мы, верныя, клічам: / “Божа, з'явіўшыся дзеля нашага выратаваньня, слава Табе!”

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Што утрымліваеш свае воды, о Ярдан? / Што вяртаеш бруі, / і не працягваеш звычайнай плыні? / "Не магу я , - гаворыць ён, - вынесьці / Агню, зьнішчаючага мяне. / Дзіўлюся і трымчу прад крайняй ласкай: / бо не звык я Чыстага абмываць, / няўмею Бязгрэшнага абціраць, / але толькі апаганеныя пасудзіны чысьціць. / Спальваць цернаў грахоў мяне вучыць / ва мне хрост прымаючы Хрыстос. / Ян сьведчыць са мною, ён, голас Слова, і заклікае: / “Вось Ягня Боская, прымаючая грэх сусьвету!” / Яму мы, верныя, клічам: / “Божа, з'явіўшыся дзеля нашага выратаваньня, слава Табе!”

**Пракімен, тон 4**

Шлях Твой у моры, і сьцежка Твая ў водах вялікіх.

**Верш:** Голас грому Твайго ў коле нябесным.

**Пс 76:20а, 19а**

**Прароцтваў Ісаі чытаньня**

І ў радасьці будзеце чэрпаць ваду з крыніц збавеньня, і скажаце ў той дзень: слаўце Госпада, заклікайце імя Яго; абвяшчайце ў народах дзеі Яго; нагадвайце, што вялікае імя Яго; сьпявайце Госпаду, бо Ён учыніў вялікае, - хай ведаюць гэта на ўсёй зямлі. Весяліся і радуйся, жыхарка Сіёна, бо вялікі сярод цябе Сьвяты Ізраілеў.

**Іс 12:3 – 6**

*Да рымлягаў пасланьня сьвятога Апостала Паўла, пачатак 91.*

*Евангельля ад Марка, пачатак 2А.*

Хай неўзабаве запабегнуць нас шчадроты Твае; бо мы зусім аслаблі.

Памажы нам, Божа, Збаўца наш, дзеля славы імя Твайго; вызвалі нас, і даруй нам грахі нашыя дзеля імя Твайго.

**Пс 78:8б, 9**

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Усясьвятая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бяспраўе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе, памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Твае, прыйдзі ўладарства Твае, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзёнага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё ёсьць валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Чытальнік:** Амін.



Убачылі Цябе вады, Божа, / убачылі Цябе вады і спужаліся. / Бо на славу Тваю ні Хэрувімы глядзець, / ні Сэрафімы зірнуць не могуць, / але, у страху прадстоячы, / адны Цябе носяць, а іншыя славяць сілу Тваю. / З імі, Міласьцівы, мы узьвяшчаем хвалу Табе і клікаем: / “З’явіўшыся Божа, памілуй нас!”

**Верш:** Што з табою, мора, чаго ты пабегла, і з табою, Ярдане, чаго павярнуўся назад?

**Пс 113:5**

У гэты дзень Творца нябёсаў і землі / у целе прыходзіць на Ярдан, / просячы вадохрышча, Бязгрэшны, / каб ачысьціць сусьвет ад памылкі варожай. / І хрост прымае ад рукі слугі Уладар усяго, / і праз ваду ачышчэньне роду чалавечаму падае. / Яму засьпяваем: / “З'явіўшыся Божа, памілуй нас!”

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 6, звышгоднага Феяфана Начартанага, япіскапа Нікейскага**

Зьзяючы сьвяцільнік, запалёны ад бясплоднай, / бачачы зазьзяўшая ад Дзевы Сонца, / просячая вадохрышча ў Ярдане, / са страхам і радасьцю заклікаў да Яго: / “Ты высьвяці мяне, Уладар, / Боскай з'яўленьням Сваім!”

**Трапар, тон 1**

Пры вадохрышчы Тваім у Ярдане, Госпад, / адкрылася глыбокая пашана Тройцы: / бо голас Айца сьведчыў аб Табе, / умілаваным Цябе Сынам мянуючы, / і Дух у выглядзе голубя / пацвярджаў Яго слова няўхільнасьць. / З'явіўшыся Хрысьце Божа / і сусьвет адукаваўшы, слава Табе! *(3)*

## НА РАНІШНЯЙ

*На “Бог Госпад:” трапар сьвята, тройчы.*

**Па 1 вяршаслоўі сядальны, тон 3**

Калі з'явіўся Ты, Выратавальнік, пры Ярдане, / і хрышчоны быў Папярэднікам, Хрысьце, / прыняў Ты сьведчаньне як Сын Адзінародны, / таму і стаў вядомы, як субязпачатковы Айцу. /

сьведчыць аб Яго Боскасьці, / бо да Роўнага Сабе прыходзіць Ён, а таксама голас з нябёсаў: / сапраўдна, адтуль прыймаючы сьведчаньне - / Выратавальнік душаў нашых.

Трапятала рука Хрысьціцеля, / калі ён прычыстай Тваёй галавы кранууся; / Ярдан-рака павярнула бруі назад, / не адважваючыся служыць Табе. / Бо тая, што Ісуса Навіна спужалася, / як магла бы не застрашыцца свайго Творцы? / Але Ты выканаў усё прадугледжанае, Выратавальнік наш, / каб выратаваць сьвет з'явай Тваёй, / Адзіны Чалавекалюбчы!

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Тон 8, звышгоднага Яна Дамаскіна**

Госпад, жадаючы выканаць / тое, што Ты вызначыў ад стагодзьдзя, / ад усяго тварэньня прыняў Ты слугаў Тваёй таемніцы: / ад Анёлаў - Гаўрыіла, ад людзей - Дзеву, / ад нябёсаў - зорку і ад вод - Ярдан, / у якім Ты беззаконьне сусьвету вынішчыў; / Выратавальнік наш, слава Табе!

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 8, Анатоля**

У гэты дзень тварэньне адукоўваецца, / у гэты дзень усё весяліцца, / разам нябёснае і зямное, / Анёлы і людзі злучаюцца, / бо дзе прышэсьце Цара, там і парадак прыходзіць. / Пасьпяшаемся жа на Ярдан / і убачым усё Яна: / як ён апускае Галаву Нерукатворную і Бязгрэшную. / Таму, апостальскае слова апяючы, сутонна паклічам: / "З'явілася дабрыня Боская, выратавальная дзеля усіх людзям, / асьвячаючая верных і падаючая вялікую міласьць!"

**Вершыры на вершоўны, тон 2, Анатоля**

Ян, убачыўшы Цябе, Хрысьце Божа, / пры Ярдане рацэ да сабе ідучым, клікаў: / "Што з'явіўся Ты, Госпад, да слугі, не маючы бруду? / У чыё жа імя Цябе ахрашчу? / Айца? Але Яго Ты носіш у Самім Сабе. / Сына? Але гэта Ты Сам, увасоблены. / Духу Сьвятога? / І Яго Ты можаш верным даваць вуснамі". / З'явіўшыся Божа, памілуй нас!

**Верш:** Мора ўгледзела, і пабегла; Ярдан павярнуўся назад.
**Пс 113:3**



**Кандак, тон 4**

Стоячы ў бруях Ярданскіх у гэты дзень, Госпад /Яну прамаўляе: / "Не бойся ахрысьціць Мяне, / бо Я прыйшоў выратаваць Адама першароднага!"

Госпадзі, памілуй. *(сорак разоў)*

Ва усякі час і ва усялякую гадзіну прыймаючы глыбокую пашану і услаўленьне на нябёсах і на зямлі Хрысьце Божа, шматцярплячы, шматміласьцівы, усяміласэрны, любячы справядлівых і міласэрны да грэшных, усіх заклікаючы да выратаваньня абяцаньнем будучых дабротаў! Сам, Госпад, прымі ў гадзіну гэтую і нашыя малітвы і накіруй жыцьцё наша да запаведзяў Тваіх,: душы нашыя асьвяці, целы ачысьці, думкі выправі, розум ачысьці і пазбаў нас ад усякай скрухі, бед і пакуты. Абгарадзі нас сьвятымі Тваімі Анёламі, каб апалчэньнем іх захоўваемыя і скіраваныя дасягнулі мы яднаньня ў веры і разуменьня непрыступнай Тваёй славы, бо Ты дабраслаўлёны ва усі стагодзьдзя. Амін.

Госпадзі, памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Хор:** Больш годную пашаны за Хэрувімаў / і без параўнаньня больш слаўную за Сэрафімаў, / што, захаваўшы дзявоцтва, нарадзіла Бога-Слова, / існую Багародзіцу – Цябе мы ўзьвялічваем.

Імём Госпада дабраславі, ойча.

**Сьвятар:** Божа, зьлітуйся над намі і дабраславі нас; выяві нам сьвятло твару Твайго і памілуй нас.

**Чытальнік:** Амін.

**Малітва сьвятога Васіля Вялікага**

Божа і Госпад Сілаў і усяго тварэньня Стваральнік, па міласэрнасьці бяспрыкладнай літасьці Тваёй Адзінароднага Сына Твайго, Госпада нашага Ісуса Хрыста паслаўшы для выратаваньня роду нашага і сьвятым Яго Крыжом рукапісаньня грахоў нашых разарваўшы і ім жа перамогу зваяваўшы над начальствамі і уладарамі цемры! Сам, чалавекалюбчы Уладар,

прымі гэтыя падзячныя і малебныя прашэньні і ад нас, грэшных, і пазбаў нас ад усякага згубнага і змрочнага граху і ад усіх, што жадаюць прычыніць нам зло бачных і нябачных ворагаў. Прыцвяч страхам прад Табою цела нашы і не дай ухіліцца сэрцам нашым да слоў або намерам заганным, але любоўю да Цябе абудзі душы нашыя, каб мы, да Цябе заўсёды імкнуўшыся і сыходзячымі ад Цябе сьвятлом скіраваныя, сузіраючы Цябе, непрыступнае і вечнае Сьвятло, няспыннае усхваленьня і падзяку Табе уздымалі, бяспачатковаму Айцу з Адзінародным Тваім Сынам і усясьвятым, і добрым, і жыватворчым Тваім Духам цяпер, і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

## ДЗЕВЯТАЯ ГАДЗІНА

Прыйдзеце, пакланемся Ўладару нашаму Богу.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да Хрыста, Уладара, нашага Бога.

Прыйдзеце, пакланемся й прыпадзем да самога Хрыста, Уладара й Бога нашага.

### Псальма 92

Царуе Гасподзь; Ён у веліч убраны, убраны Гасподзь у магутнасьць і перапаясаны: сусьвет таму цьвёрды, ня зрушыцца. Трон Твой угрунтаваны спаконвечна; Ты - ад вечнасьці. Узвышаюць рэкі, Госпадзе, узвышаюць рэкі голас свой, узвышаюць рэкі хвалі свае. Але над шумам водаў вялікіх, моцных хваляў марскіх, моцны ў вышыных Гасподзь. Сьведчаньні Твае бяз сумненьня пэўныя. Дому Твайму, Госпадзе, належыць сьвятасьць на доўгія дні.

### Псальма 113

Калі выйшаў Ізраіль зь Егіпта, дом Якава - з народу іншапляменнага, Юда зрабіўся сьвятыняю Ягонаю, Ізраіль - валоданьнем Ягоным. Мора ўгледзела, і пабегла; Ярдан павярнуўся назад. Горы скакалі, як бараны, і пагоркі, як ягняткі. Што з табою, мора, чаго ты пабегла, і з табою, Ярдане, чаго павярнуўся назад? Чаго вы скачаце, горы, як бараны, і вы,



усіх іх Гасподзь вызваляе. Ён хавае ўсе косткі ягоныя; і ніводная не паламаецца! Зло заб'е грэшніка, і ненавісьнікі праведнасьці загінуць. Гасподзь вызваліць душу рабоў Сваіх, і не загіне ніхто, хто на Яго спадзяецца.

*Пасьля водпуску Літургіі параеклісіарх запальвае выносную сьвечку і ставіць пасярод цэрквы, а клір і хор разам, сьпяваюць трапар сьвята, Слава, і цяпер: кандак, і шматгодзьдзя.*

*Усяночнае служэньня пачынаецца з вялікага павячор'я з сьпевам "З намі Бог"; і замест трапароў звычайных: "Адукуй вочы мае:" трапар сьвята. І замест: "Памілуй нас, Госпад, памілуй нас:" кандак сьвята. Пасьля жа вялікага усхваленьня здзяйсьняецца ліція.*

### Вершыры на ліціі, тон 4. Звышгоднага Касмы Маіўмскага

Апранаючыся сьвятлом, як вопраткаю, / дабраваліў дзеля нас зрабіцца падобным нам; / Ён у гэты дзень апускаецца ў бруі Ярданскія, / Сам не патрабуючы ў іх ачышчэньня, / але ў Сабе здзяйсьняючы наша адраджэньне. / О, цуд! / Без агнюператапляе / і узнаўляе без разбурэньня / і ратуе ў імя Яго адукоўваемых, / Хрыстос Бог і Выратавальнік душаў нашых.

Цябе, Духам і агнём ачышчаючага грэх сусьвету, / бачачы Хрысьціцель крочачым да сабе, / у жаху і трапятаньні заклікаючы, клікаючы: / "Не сьмею крануць галавы Тваёй прычыстай, / Ты мяне высьвяці, Уладар, / Боскім з'яўленьням Тваім, / Адзіны Чалавекалюбчы!"

Прыйдзіце, пераймаць будзем мудрым дзевам, / прыйдзіце, сустрэнем з'явіўшагася Уладара, / бо прыйшоў Ён, як Жаніх, да Яна. / Ярдан, бачыўшы Цябе, спужаўся і стаў; / Ян жа заклікаў: / "Не сьмею крануць галаву Несьмяротнага!" / Дух сыходзіць у выглядзе голубя, каб воды асьвяціць, / і голас гучаў з нябёсаў: / "Гэты ёсьць Сын Мой, / прыйшоўшы ў сусьвет выратаваць род чалавечы!" / Госпад, слава Табе!

Прымае Хрост Хрыстос і выходзіць з вады, / каб з Сабой узьвесьці да выратаваньня сусьвет; / і сузірае адчыніўшыеся нябёсы, / якія Адам зачыніў сабе і нашчадкам сваім; / і Дух

*асьвячэньня вернікаў вадою сьпяваецца усімі трапар. Затым жа уваходзім у храм і сьпяваем вершыру:*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Вершыра, тон 6:**

Апяем, праваслаўныя, / веліч адбыўшагася дзеля нас Боскага дабраваленьня: / бо з-за нашага граху стаўшы Чалавекам, / нашым ачышчэньнем чысьціцца ў Ярдане / Адзіны Чысты і Бязгрэшны, / асьвячаючы мяне і воды / і галовы зьмеяў зваяваўшы ў вадзе. / Зачэрпаем жа воды з весялосьцю, браты: / бо дабрыня Духу з верая чорпаючым / нябачна падаецца ад Хрыста Бога / і Выратавальніка душаў нашых.

Ды будзе імя Госпада дабраслаўлёна цяпер і заўсёды. *(3)*

## ПСАЛЬМА 33

Дабраслаўляю Госпада ва ўсякую пору; хвала Яму няспынная ў вуснах маіх. Госпадам будзе хваліцца душа мая; пачуюць пакорныя і ўзьвяселяцца. Вялічайце Госпада са мною, і ўзносьма імя Ягонае разам. Я шукаў Госпада, і Ён пачуў мяне і ад усякіх небясьпекаў маіх вызваліў мяне. Хто прыглядваўся да Яго, тыя прасьвятліліся, і твары іхнія ня зьведаюць сораму. Вось убогі паклікаў, - і Гасподзь пачуў і ўратаваў яго ад усіх ягоных бедаў. Гасподні анёл паўстае вакол тых, хто баіцца Яго, - і іх вызваляе. Паспытайце і ўбачыце, які добры Гасподзь! Дабрашчасны той чалавек, што на яго спадзяецца! Бойцеся Госпада, усе сьвятыя Ягоныя; бо ня маюць нястачы тыя, што баяцца Яго. Ільвяняты церпяць нягоды і голад, а богашукальнікі ня церпяць нястачы ні ў якім дабры. Прыйдзеце, дзеці, паслухайце мяне: страху Гасподняму вас навучу. Ці хоча чалавек жыць і ці любіць дабрадзенства, каб бачыць дабро? Трымай язык свой ад злога і вусны свае ад падступных словаў. Ухіляйся ад ліха і рабі дабро; шукай міру і йдзі за ім. Вочы Гасподнія - на праведных, і вушы Ягоныя - на скаргу іхнюю. А аблічча Гасподняе - супроць тых, што робяць ліхое, каб зьвесьці зь зямлі памяць пра іх. Клічуць, і Гасподзь чуе, і ад усіх уціскаў іх вызваляе. Блізкі Гасподзь да тых, у каго зламанае сэрца, і пакорлівых духам - уратуе. Многа турботаў у праведніка, і ад



пагоркі, як ягняткі? Прад абліччам Госпада дрыжы, зямля, прад абліччам Бога Якава, Які ператварае скалу ў возера вады і камень - у крыніцу вады. Ня нам, Госпадзе, ня нам, а імю Твайму дай славу, дзеля ласкі Тваёй, дзеля праўды Тваёй. Навошта язычнікі кажуць: дзе ж іхні Бог? Бог наш на небе і на зямлі; творыць усё, што хоча. А іхнія ідалы - срэбра і золата, творы рук чалавечых. Ёсьць у іх вусны, але не гавораць; ёсьць у іх вочы, але ня бачаць; ёсьць у іх вушы, але ня чуюць; ёсьць у іх ноздры, але нюху няма; ёсьць у іх рукі, але не адчуваюць; ёсьць у іх ногі, але ня ходзяць; і яны гукаў не выдабываюць з горла свайго. Няхай будуць да іх падобныя тыя, што іх робяць, і ўсе, хто на іх спадзяецца. Доме Ізраілеў! спадзявайся на Госпада; Ён - нам дапамога і шчыт. Доме Ааронаў! спадзявайся на Госпада; Ён - нам дапамога і шчыт. Хто баіцца Госпада! спадзявайся на Госпада; Ён - нам дапамога і шчыт. Гасподзь нас памятае, дабраслаўляе нас, дабраслаўляе Ізраілеў дом, дабраслаўляе Ааронаў дом; дабраслаўляе тых, што баяцца Госпада, малых і вялікіх. Няхай дадасьць вам Гасподзь болей і болей, вам і дзецям вашым, дабраслаўлёныя вы Госпадам, Які стварыў неба і зямлю. Неба - неба Госпаду, а зямлю Ён даў сынам чалавечым. Ня мёртвыя ўслаўляць Госпада, ні ўсё, што ў магілу сыходзіць, а мы жывыя дабраслаўляцьмем Госпада ад сёньня і давеку.

## Псальма 85

Нахілі, Госпадзе вуха Тваё, і пачуй мяне; бо я бедны і ўбогі. Ахавай душу маю, бо я богабаязны; уратуй, Божа мой, раба Твайго, які на Цябе спадзяецца. Зьлітуйся зь мяне, Госпадзе, бо Цябе я клічу кожнага дня. Разьвесялі душу раба Твайго, бо да Цябе, Госпадзе, узношу душу сваю, бо Ты, Госпадзе, добры і міласэрны і мілажальны да ўсіх, хто кліча Цябе. Пачуй, Госпадзе, малітву маю, і прыслухайся да голасу маленьня майго. У дзень смутку майго я клічу Цябе, бо Ты пачуеш мяне. Няма, Госпадзе, паміж багамі такога, як Ты, і дзеяў няма, як Твае. Усе народы, Табою створаныя, прыйдуць і схіляцца прад Табою, Госпадзе, і праслявяць імя Тваё, бо Ты вялікі, творыш дзівосы, - Ты, Божа, адзіны Ты. Настаў мяне, Госпадзе, на

дарогу Тваю, і хадзіцьму ў праўдзе Тваёй; умацуй сэрца маё ў страху імя Твайго Буду славіць Цябе, Госпадзе, Божа мой, усім сэрцам маім і славіць імя Тваё вечна, бо вялікая ласка Твая да мяне; Ты выбавіў душу маю ад пекла апраметнага. Божа! на мяне гардуны паўсталі, і хэўра мяцежнікаў шукае душы маёй; і перад сабою ня ставяць Цябе. Але Ты, Госпадзе, Божа шчодры і сэрцам шчыры, доўгацярплівы і шматлітасьцівы і справядлівы, паглядзі на мяне і ўмілажалься зь мяне; дай моц Тваю рабу Твайму, і ўратуй сына рабы Тваёй; учыні на мне азнаку на добрае, хай бачаць мяне ненавісьнікі мае і пасаромяцца, бо Ты, Госпадзе, дапамог мне і суцешыў мяне.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Алілуя, алілуя, алілуя, слава Табе, Божа. *(тры разы)*

Госпадзі, памілуй. *(тры разы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Трапар, тон 4**

Назад пацякла некалі Ярдан-рака / ад дабрыні Ялісея па ушэсьці Ільлі, / і падзяляліся воды туды і сюды, / і стаў дзеля яго сухім шлях па вільгаці, / як праўобраз праўдзівы вадохрышча, / якім мы пераходзім шлях цякучага жыцьця. / Хрыстос з'явіўся ў Ярдане, асьвячаючы воды.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Багародзічны:** Дзеля нас народжаны ад Дзевы і расьпяцьце перацярпеўшы, / зваяваўшы сьмерцю сьмерць і выявіўшы уваскрошаньня як Бог, / не пагрэбуй, Добры, створанымі рукой Тваёю; / выяві чалавекалюбства Тваё, Міласьцівы, / прымі нарадзіўшую Цябе Багародзіцу, хадатайкай за нас, / і выратуй, Выратавальнік наш, людзей у адчаі перабываючых.

**Вершыры дзевятай гадзіны, тон 7**

Дзівосна было бачыць / Творцу нябёсаў і зямлі ў рацэ аголеным, / ад слугі прыймачым вадохрышча / дзеля нашага выратаваньня, падобна слузе. / І хоры Анёлаў дзівіліся / са страхам і радасьцю. / З імі мы пакланяемся Табе: / “Выратуй



тварэньнем бачным і нябачным услаўлялася Тваё усясьвятое Імя, з Айцом, і Сьвятым Духам, цяпер, і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Хор:** Амін.

**Сьвятар:** Мір усім.

**Хор:** І твайму духу.

**Дыякан:** Галавы нашы прад Госпадам схілім.

**Хор:** Табе, Госпадзі.

**Малітва галавасхіленьня**

Схілі, Госпад, вуха Тваё, і пачуй нас, у Ярдане прыняць вадохрышча дабраваліўшы і асьвяціўшы воды! І дабраслаў усіх нас, скланеньнем галоваў сваіх паказваючых Табе слугі пакорнасьць, і удастой нас быць Табой асьвячанымі праз прыняцьце гэтай вады і акрапленьня ёю, ды будзе яна нам, Госпадзі, у здароўе душы і цела.

Бо Ты - асьвячэньне душаў і целаў нашых, і Табе славу, і падзяку, і пакланеньня узносім, з безпачатковым Тваім Айцом і усясьвятым і добрым і жыватворчым Тваім Духам цяпер, і заўсёды, і на вякі вякоў.

**Хор:** Амін.

*І затым, сьвятар, трымаючы сьвяты Крыж двума рукамі, дабраслаўляе ім ваду крыжападобна, і апускае яго ў ваду, з сьпевам наступнага трапара:*

**Трапар, тон 1**

Пры вадохрышчы Тваім у Ярдане, Госпад, / адкрылася пакланеньня Тройцы: / бо голас Айца сьведчыў аб Табе, / умілаваным Цябе Сынам мянуючы, / і Дух у выглядзе голубя / пацвярджаў Яго слова няўхільнасьць. / З'явіўшыся Хрысьце Божа / і сусьвет адукаваўшы, слава Табе!

*І яшчэ два разу таксама Крыжом азначае ваду, пры сьпеве трапара старэйшым сьвятаром з суслужачымі яму сьвятарамі і хорам. Затым сьвятар узяўшы чару асьвячонай вады і зьвернучыся на захад тварам, у левым руцэ трымаючы сьвяты Крыж, а ў правай крапіла, кропіць крыжападобна ва усе бакі, а затым падыходзячых да Крыжа вернікаў. Падчас*

наш на зямлі з'явіўся і меў зносіны з людзьмі. Ты і ярданскія бруі высьвяціў, паслаўшы з нябёсаў Усясьвятога Твайго Духа і зьнішчыў галовы перабываючых там зьмеяў.

*І прамаўляе тры разы, дабраслаўляючы воду на кожны верш:*

Ты Сам, чалавекалюбны Уладар, прыйдзі і цяпер натхненьнем Сьвятога Твайго Духу і высьвяці ваду гэтую! *(3)*

І дай ёй дабрыню збавеньня, дабраслаўленьня Ярдана, зрабі яе крыніцай нятленьня, падарункам асьвячэньня, вызваленьнем ад грахоў, абаронай ад хвароб, пагібельнай дэманам, для варожых сіл недасягальнай, мошчы Анёльскай напоўненай, каб усё, чарпаючыя і прыймаючыя, мелі яе дзеля ачышчэньня душы і целы, для вылячэньня ад запалу, для асьвячэньня дамоў і прыдатнай дзеля усякай карыснай справы. Бо Ты, Бог наш, вадою і Духам абнавіў струхлелую ад граху існасьць нашу. Ты, Бог наш, вадою патапіў пры Ною грэх. Ты, Бог наш, морам вызваліў ад рабства фараону праз Майсея род жыдоўскі. Ты, Бог наш, скасаваў скалу ў пустэльні, і пацяклі воды, і струмені перапоўніліся, і прагнуўшых людзей Тваіх Ты насыціў. Ты, Бог наш, вадою і агнём пазбавіў праз Ільлю Ізраіль ад спакушэньня Ваалам.

Сам і цяпер, Уладыка, асьвяці ваду гэтую Духам Тваім Сьвятым. *(3)*

Дай жа усім: і датыкаючымся да яе, і намашчываючымся, і прыймачым яе, асьвячэньня, здароўя, ачышчэньня і дабраслаўленьня.

І выратуй, Госпад, слугаў Тваіх, верных кіраўнікоў нашых *(імёны)*, і захавай іх пад прытулкам Тваім у міры, заваюй пад ногі іх усякага ворага і непрыяцеля, даруй ім усё прасімая, што служыць да выратаваньня і жыцьцё вечнае.

Успомні, Госпад, сьвяцейшага патрыярха нашага *(імя)*, і прысьвятога мітрапаліта (або: архіяпіскапа, або: япіскапа) нашага *(імя)*, і усякае сьвятарства, і увесь іншы сьвяты чын, і усіх стаячых вакол людзей, і па важлівых падставах адсутных братоў нашых, і памілуй іх і нас па вялікай Тваёй міласэрнасьці, каб і стыхіямі, і Анёламі, і людзьмі, і усім



нас, Госпад!” *(2)*

**Верш:** Бо я пра Цябе ўспамінаю / зь зямлі Ярданскай, зь Ярмона.

**Пс 41:7б**

Калі убачыў Папярэднік / ідучага да яго Госпада Славы, ён заклікаў: / “Вось, з'явіўся Вызваляючы сусьвет ад тленьня. / Вось, Ён пазбаўляе нас ад скрухі, / вось, Падаючы прабачэньне грахоў на зямлі. / Ад Дзевы Чыстай Ён прыйшоў па Сваёй міласэрнасьці / і замест рабоў стварае сыноў Боскіх, / а замест цемры асьвячае чалавецтва / вадою Боскага вадохрышча Свайго!” / З гэтага часу давайце будзем сутонна усхваляць Яго / з Айцом і Сьвятым Духам!

**Верш:** Бачылі Цябе, Божа, воды, бачылі Цябе воды, і напалохаліся.

**Пс 76:17а**

Калі убачыў Папярэднік / ідучага да яго Госпада Славы, ён заклікаў: / “Вось, з'явіўся Вызваляючы сусьвет ад тленьня. / Вось, Ён пазбаўляе нас ад скрухі, / вось, Падаючы прабачэньне грахоў на зямлі. / Ад Дзевы Чыстай Ён прыйшоў па Сваёй міласэрнасьці / і замест рабоў стварае сыноў Боскіх, / а замест цемры асьвячае чалавецтва / вадою Боскага вадохрышча Свайго!” / З гэтага часу давайце будзем сутонна усхваляць Яго / з Айцом і Сьвятым Духам!

*Потым кананарх, стоячы пасярод храма, гучна вымаўляе:*

## Вершыра, тон 5:

Руку тваю, дакрануўшуюся да усячыстай галавы Уладары, / пальцам якой на Яго ты і паказаў, / паднімі за нас да Яго, Хрысьціцель, / як маючы адвагу вялікую, / бо ты нават прыняў ад Яго сьведчаньне, / як большы з усіх пракокаў. / Вочы жа твае, пабачыўшыя Усясьвятого Духа, / як бы ў выглядзе голуба сыйшоўшага, / ізноў накіруй да Яго, Хрысьціцель, / зрабіўшы Яго міласьцівым да нас. / І прыйдзі, стань з намі, / зацвердзіўшы як бы пячаткай наш сьпеў / і прадпачыная урачыстасьць.

## Шматгодзьдзя[2]

**Сьвятар:** Найсьвяцейшым патрыярхам праваслаўным: Канстанцінопальскаму, Александрыйскаму, Анціахійскаму, Ерусалімскаму, Грузінскаму, Сэрбскаму, Румынскаму, Балгарскаму, і усіх іншых аўтакефальных цэркваў першагіерархам, шматлікая гады.

Уладыцы нашаму Прысьвятому *(імя*), япіскапу *(назва катэдры)* з богазахаванай яго паствою шматлікая гады.

Прысьвятым мітрапалітам, архіяпіскапам і япіскапам, параху гэтага сьвятога храму, і ўсяму сьвяшчанічаму кліру шматлікія гады

Хрысьціянскай набожнасьці вернікам і абаронцам Хрыстовай Царквы і ўсім праваслаўным хрысьціянам падай, Госпад, мір і дабробыт, і шматлікасьць пладоў зямных, і шматлікія гады.

***У манастырах:*** Збаў, Хрыстос Бог, вялебнага айца нашага ігумена (альбо архімандрыта, - імя), з братамі ў Хрысьце, і сьвяты манастыр гэты ў міры захавай, і храм гэты сьвяты ўмацуй на вякі вякоў. Амін.

**Хор:** Збаў, Хрыстос Бог. *(3)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

### Вершыра, тон 5:

Руку тваю, дакрануўшуюся да усячыстай галавы Уладары, / пальцам якой на Яго ты і паказаў, / паднімі за нас да Яго, Хрысьціцель, / як маючы адвагу вялікую, / бо ты нават прыняў ад Яго сьведчаньне, / як большы з усіх пракокаў. / Вочы жа твае, пабачыўшыя Усясьвятого Духа, / як бы ў выглядзе голуба сыйшоўшага, / ізноў накіруй да Яго, Хрысьціцель, / зрабіўшы Яго міласьцівым да нас. / І прыйдзі, стань з намі, / зацвердзіўшы як бы пячаткай наш сьпеў / і прадпачыная урачыстасьць.

---

[2] Згодна старажытнай беларускай традыцыі, Шматгодзьдзя сьпяваецца менавіта на Гадзінах. Але, улічвая сучасныя ўмовы, у саборных і прыходскіх храмах можа сьпявацца ў канцы Сьв. Літургіі альбо вячорняй



нявартых слугаў Тваіх, па Боскаму Тваім абяцаньню вадой ачышчальнай, Тваёй міласэрнасьці падарунак, каб прашэньне нас, грэшных, над гэтай вадою было дабрапрыемна Тваёй дабрыні і дабраслаўленьня Тваё было падаравана і нам, і усім верным людзям Тваім у славу Сьвятога і годнашануемага Твайго імя. Бо Табе належыць уся слава, гонар і пакланеньня з безпачатковым Тваім Айцом, і усясьвятым і добрым і жыватворчым Тваім Духам цяпер, і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

*Сьвятар запаляньмі сьвячкамі тройчы праводзіць над вадой крыжавобразна, пагружаючы сьвечкі ў воду, і прамаўляе гучна:*

Вялікі Ты, Госпад, і дзівосныя справы Твае, і ніякага слова не будзе дастаткова, каб апець цуды Твае! *(3)*

Бо Ты па Сваёй волі усё прывёў з нябыту да быцьця, Сваёй сілаю утрымліваеш тварэньне і Сваёй воляй кіруеш сусьветам. Ты з чатырох стыхій склаўшы тварэньне, чатырма порамі увянчаў круг года. Прад Табойтрымцяць усе духоўныя сілы, Цябе асьпявая сонца, Цябе славіць месяц, з Табою гутараць зоркі, Табе падпарадкоўваецца сьвятло, прад Табою калыхаюцца бездані, Табе па-рабску служаць крыніцы. Ты расьцягнуў нябёсы як покрыва з скуры, Ты зацвердзіў зямлю на водах, Ты абгарадзіў мора пяском, Ты выказаў паветра для дыханьня. Анёльскія сілы Табе служаць, хоры Арханёлаў Табе пакланяюцца, шматвокія Хэрувімы і шасьцікрылыя Сэрафімы, стаячыя вакол і лятаючыя, у страху ад Тваёй непрыступнай славы затуляюцца.

Бо Ты, Богістотай неапісальны, безпачатковы і невымоўны, прыйшоў на зямлю, прыняўшы выяву слугі, стаўшы падобным чалавеку; бо Ты міласэрны Уладар, па Сваёй літасьці, не мог глядзець на род чалавечы, муку ад д'ябла прымаючы, але прыйшоў і выратаваў нас. Спавядаем дабрыню, прапаведуем літасьць, не утойваем дабрадзейства, бо Ты пакаленьня існасьці нашага вызваліў, нявіннае улоньне высьвяціў нараджэньням Сваім. Усё тварэньне асьпяваюць Цябе, з'явіўшагася. Бо Ты, Бог

Аб чарпаючых і бяруячых яе для асьвячэньня дамоў, Госпаду памолімся.

Каб паслужыць ёй да ачышчэньня душы і целы усім, з вераю чарпаючым і прыймачым яе, Госпаду памолімся.

Каб удастоіцца нам поўнаты асьвячэньня праз прыняцьце гэтых вод нябачнай з'явай Сьвятога Духу, Госпаду памолімся.

Каб пачуў Госпад Бог голас маленьня нас, грэшных, і памілаваў нас, Госпаду памолімся.

Каб нам выратавацца ад усялякага гора, гневу, нябясьпекі і нядолі, Госпаду памолімся.

Абарані, ратуй, памілуй і захавай нас, Божа, ласкаю Тваёй.

Успомніўшы ўсясьвятую, ўсясчыстую, усядабраслаўлёнуюЎладарку нашу Багародзіцу і ўвесь час Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самых сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддамо.

**Людзі:** Табе, Госпадзі.

**Таемная малітва сьвятара[4]:**

Госпадзі Ісусе Хрысьце, Адзінародны Сын, Існы ва улоньні Айца, праўдзівы Божа, Крыніца жыцьця і неўміручасьці, Сьвятло ад Сьвятла, прыйшоўшы ў сусьвет адукаваць яго! Асьвяці нашу думку Сьвятым Тваім Духам і прымі нас, узьвялічваючых Цябе і падзяку Табе прыносячых аб адбыўшыхся ад стагодзьдзя дзівосных Тваіх і вялікіх справах і зьдзясьніўшайся ў апошнія стагодзьдзі выратавальнай Тваёй задуме, калі, апранушыся ў нашу складаную існасьць, нямоглую і бедную і сышоўшы да стану слугі, Ты, Цар усяго, яшчэ і прыняў вадохрышча ў Ярдане ад рукі слугі, каб, высьвяціўшы водную існасьць, Бязгрэшны, пракласьці нам шлях да адраджэньня вадою і Духам і вярнуць нас да першапачатковай волі. Сьвяткуючы жа успамін гэтай Боскай таемніцы, молім Цябе, Уладар Чалавекалюбчы, акрапі на нас,

[4] Калі чын асьвячэньня адпраўляецца з дыяканам – малітва прамаўляецца сьвятаром пад час екценьні.



*Адбываецца каджэньня ўсяго храму.*

**Пракімен, тон 3**

Гасподзь - сьвятло маё і ратунак мой: каго мне баяцца?

**Верш:** Гасподзь - цьвярдыня жыцьця майго: каго мне палохацца?

**Пс 26:1**

**Прароцтваў Ісаі чытаньня.**

Так кажа Гасподзь: у час спрыяльны Я пачуў Цябе, і ў дзень выратаваньня дапамог Табе; і Я буду ахоўваць Цябе і зраблю Цябе запаветам народу, каб узнавіць зямлю, каб вярнуць спадчыньнікам спадчыну спусташэньня, сказаў вязьням: «выходзьце», і тым, якія ў цемры: “пакажэцеся”. Яны пры дарогах будуць пасьвіць, і на ўсіх пагорках будуць пашы іхнія; ня будуць цярпець голаду і смагі, і не дастане іх сьпёка і сонца; бо Той, Хто мілуе іх, будзе весьці іх і прывядзе іх да крыніцы водаў. І ўсе горы Мае зраблю шляхам, і дарогі Мае будуць паднятыя. Вось, яны прыйдуць здалёку; і вось, - адны з поўначы і мора, а другія - зь зямлі Сінім. Радуйцеся, нябёсы, і весяліся, зямля, і гудзеце, горы, ад радасьці; бо суцешыў Гасподзь народ Свой і памілаваў пакутнікаў Сваіх. А Сіён казаў: “пакінуў мяне Гасподзь, і Бог мой забыў мяне!” Ці забудзе жанчына немаўля сваё, каб не пашкадаваць сына ўлоньня свайго? але калі б і яна забыла, дык Я не забуду цябе.

**Іс 49:8 – 15**

*Да Ціта пасланьня сьвятога Апостала Паўла, пачатак 302.*

*Евангельля ад Мацьвея, пачатк 6.*

Не здрадзь нас да канца дзеля імя Твайго, і не разбуры запавету Твайго.

Не аднімі ад нас міласэрнасьці Тваёй дзеля Аўраама, умілаванага Табою, дзеля Язэпа, слугі Твайго, і Ізраіля, сьвятога Твайго.

**Дан 3:34,35**

Сьвяты Божа, Сьвяты Моцны, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Усясьвятая Тройца, зьлітуйся над намі. Госпадзе, ачысьці правіны нашы. Уладару, выбач бясправуе наша. Сьвяты, наведай нас і аздараві немачы нашы дзеля імя Твайго.

Госпадзе, памілуй. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Твае, прыдзі ўладарства Твае, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзёнага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё ёсьць валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Чытальнік:** Амін.

### Кандак, тон 4

Стоячы ў бруях Ярданскіх у гэты дзень, Госпад /Яну прамаўляе: / "Не бойся ахрысьціць Мяне, / бо Я прыйшоў выратаваць Адама першароднага!"

Госпадзі, памілуй. *(сорак разоў)*

Ва усякі час і ва усялякую гадзіну прыймаючы глыбокую пашану і услаўленьне на нябёсах і на зямлі Хрысьце Божа, шматцярплячы, шматміласьцявы, усяміласэрны, любячы справядлівых і міласэрны да грэшных, усіх заклікаючы да выратаваньня абяцаньнем будучых дабротаў! Сам, Госпад, прымі ў гадзіну гэтую і нашыя малітвы і накіруй жыцьцё наша да запаведзяў Тваіх,: душы нашыя асьвяці, целы ачысьці, думкі выправі, розум ачысьці і пазбаў нас ад усякай скрухі, бед і пакуты. Абгарадзі нас сьвятымі Тваімі Анёламі, каб апалчэньнем іх захоўваемыя і скіраваныя дасягнулі мы яднаньня ў веры і разуменьня непрыступнай Тваёй славы, бо Ты дабраслаўлёны ва усі стагодзьдзя. Амін.

Госпадзі, памілуй. *(тройчы)*



мітрапаліце (альбо: архіяпіскапе, альбо: япіскапе) нашым *(імя)*, шаноўнае сьвятарства, у Хрысьце дыяканства, аб усім кліры і народзе Божым, Госпаду памолімся.

За Богазахаваную краіну нашу Беларусь, за ўвесь народ і ўладу яе Госпаду памолімся.

За месца гэтае, за ўсе месцы і краіны, і за веруючых людзей, што жывуць у іх, Госпаду памолімся.

За спрыяльнае надвор'я, багаты ўраджай пладоў зямных і за часы мірныя, Госпаду памолімся

За вандруючых па вадзе, зямлі і ў паветры, за нядужых, і за тых, што пакутваюць, за зьняволеных і за выратаваньня іх, Госпаду памолімся.

Аб асьвячэньні гэтай вады сілай, і дзеяньнем, і натхненьнем Сьвятога Духу Госпаду памолімся.

Аб прышэсьці на гэтыя воды ачышчальнага дзеяньня Усявышэйшай Тройцы Госпаду памолімся.

Аб паданьні ім дабрыні збавеньня, дабраслаўленьня моцыю Ярдана, і дзеяньнем, і натхненьнем Сьвятога Духу, Госпаду памолімся.

Ды будзе зрынуты сатана пад ногі нашы неўзабаве і разбурыцца усякі злы намер, накіраваны на нас, Госпаду памолімся.

Каб Госпад Бог пазбавіў нас ад усякага паклёпу і спакусы суперніка і зрабіў годнымі абяцаных выгод, Госпаду памолімся.

Аб адукаваньні нас сьвятлом ведаў і набожнасьці натхненьнем Сьвятога Духу, Госпаду памолімся.

Каб паслаў Госпад Бог дабраслаўленьня Ярдана і высьвяціў гэтыя воды, Госпаду памолімся.

Каб стала гэтая вада асьвячэньня падарункам, ад грахоў збавеньнем, для вылячэньня душы і целы і для усякай карыснай справы прыдатнай, Госпаду памолімся.

Каб стала гэтая вада бягучай у жыцьцё вечная, Госпаду памолімся.

Каб з'явіцца ёй абаронай ад усякай задумы бачных і нябачных ворагаў Госпаду памолімся.

цярноўніку вырасьце кіпарыс; замест крапівы вырасьце мірт; і гэта будзе на славу Госпаду, на знак вечны, непарушны.

**Іс 55:1 – 13**

**3. Прароцтваў Ісаі чытаньня.**

І ў радасьці будзеце чэрпаць ваду з крыніц збавеньня, і скажаце ў той дзень: слаўце Госпада, заклікайце імя Яго; абвяшчайце ў народах дзеі Яго; нагадвайце, што вялікае імя Яго; сьпявайце Госпаду, бо Ён учыніў вялікае, - хай ведаюць гэта на ўсёй зямлі. Весяліся і радуйся, жыхарка Сіёна, бо вялікі сярод цябе Сьвяты Ізраілеў.

**Іс 12:3 – 6**

**Пракімен, тон 3**

Гасподзь - сьвятло маё і ратунак мой: каго мне баяцца?

**Верш:** Гасподзь - цьвярдыня жыцьця майго: каго мне палохацца?

**Пс 26:1**

*Першае пасланьня да Карынфянаў сьвятога Апостала Паўла, пачатак 143а*

**Алілуя, тон 4**

Голас Гасподні над водамі, Бог славы загрымеў, Гасподзь над вялікімі водамі.

**Пс 28:3**

**Верш:** Мора ўгледзела, і пабегла; Ярдан павярнуўся назад.

**Пс 113:3**

*Евангельля ад Марка, пачатак 2.*

**Вялікая екценьня**

**Дыякан:** У спакоі Госпаду памолімся.

**Людзі** *(на кожную просьбу)***:** Госпадзі, памілуй.

За спакой з нябёсаў і выратаваньня душаў нашых, Госпаду памолімся.

За спакой ва ўсім сусьвеце, за непахіснасьць сьвятых Божых цэркваў і за зьяднаньня ўсіх, Госпаду памолімся.

За сьвятыню гэтую і за ўсіх, хто зб вераю і з страхам Божым уваходзіць у яе, Госпаду памолімся.

За сьвяцейшага патрыярху нашым *(імя)*, і аб прысьвятога



Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Хор:** Больш годуную пашаны за Хэрувімаў / і без параўнаньня больш слаўную за Сэрафімаў, / што, захаваўшы дзявоцтва, нарадзіла Бога-Слова, / існую Багародзіцу – Цябе мы ўзьвялічваем.

Імём Госпада дабраславі, ойча.

**Сьвятар:** Божа, зьлітуйся над намі і дабраславі нас; выяві нам сьвятло твару Твайго і памілуй нас.

**Чытальнік:** Амін.

**Малітва сьвятога Васіля Вялікага**

Уладар Госпад, Ісусе Хрысьце, Божа наш, шматцярплячы да нашых грахоў і нават да цяперашняй гадзіны давёўшы нас, калі Ты, вісячы на жыватворчым Дрэве разважліваму разбойніку адкрыў шлях да уваходу ў рай і сьмерцю зьнішчыў сьмерць. Будзь міласьцівы да нас, грэшным і нявартым слугам Тваім, бо мы зграшылі і здзейсьнілі беззаконьне і не годныя падняць вочы нашы і паглядзець на вышыню нябёсную, бо мы пакінулі шлях праўды Тваёй і сталі хадзіць па жаданьням сэрцаў нашых. Але умольваем Тваю бязьмерную дабрыню: пашкадуй нас, Госпад, па мностве міласьці Тваёй і выратуй нас дзеля імя Твайго сьвятога, бо высіліліся ў мітусьні дні нашыя. Збаў нас з рук ворага, і прабач нам грахі нашы, і забі нашы цялесныя думкі, каб склаўшы з сябе трухлявага чалавека, мы апрануліся у новага і сталі жыць дзеля Цябе, нашага Уладара і Дабрадзея. І так, прытрымліваючыся Тваім наказам, дасягнулі месца вечнага супакою, дзе усіх весялячыхся жыльлё. Бо Ты - сапраўды праўдзівае вясельля і радасьць любячы Цябе, Хрысьце Божа наш, і Табе славу аддаем з бяспачатковым Тваім Айцом і усясьвятым, і добрым, і жыватворчым Тваім Духам, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

## ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ

### Псальма 102

Дабраславі, душа мая, Госпада, і ўсё нутро маё - сьвятое імя Ягонае. Дабраславі, душа мая, Госпада, і не забывай усіх добрых дзеяў Ягоных. Ён даруе ўсе беззаконьні твае; ацаляе ўсе немачы твае; ад магілы жыцьцё тваё вызваляе, вянчае цябе міласьцю і шчадротамі; насычае дабротамі жаданьні твае: абнаўляецца, як арол, юнацтва тваё. Гасподзь творыць праўду і суд усім пакрыўдажаным. Ён паказаў шляхі Свае Майсею, сынам Ізраілевым - дзеі Свае. Шчодры і міласьцівы Гасподзь, вельмі цярплівы і шчодраміласьцівы: не да канца гневаецца і не навек абураецца. Не паводле злачынстваў нашых стварыў нам, і не паводле грахоў нашых аддаў нам: бо, як высока неба над зямлёю, так вялікая ласка Госпада да тых, хто баіцца Яго; як далёка ўсход ад захаду, так аддаліў Ён ад нас беззаконьні нашыя; як бацька даруе сынам, так даруе Гасподзь тым, хто баіцца Яго. Бо Ён ведае склад наш, памятае, што мы - пыл. Дні чалавечыя - як трава; як польная краска, так ён цьвіце. Пройдзе над ім вецер, і няма яго, і месца ягонае ўжо не пазнае яго. А ласка Гасподняя зьвеку й давеку тым, хто баіцца Яго, і праўда Ягоная на сынах сыноў, якія захоўваюць запавет Ягоны і памятаюць наказы Ягоныя, каб выконваць іх. Гасподзь на нябёсах паставіў Свой трон, і царства Ягонае ўсім валодае. Дабраслаўвеце Госпада, усе анёлы Ягоныя, моцныя сілаю, выканаўцы слова Ягонага. Дабраслаўвеце Госпада, усе войскі Ягоныя, службіты Ягоныя, што выконваюць волю Ягоную. Дабраслаўвеце Госпада, усе дзеі Ягоныя, ва ўсіх месцах валадарства Ягонага. Дабраславі, душа мая, Госпада!

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

### Псальма 145

Хвалі душа мая Госпада. Буду славіць Госпада, пакуль жыву; пецьму Богу майму, пакуль існую. Не кладзеце надзеяў на князёў, на сына людзкога, у якім ратунку няма. Выходзіць дух ягоны, і ён вяртаецца ў зямлю сваю; у той дзень зьнікаюць усе намеры ягоныя. Шчасны, каму памочнік Бог Якаваў, у каго



хадзіць па ім; але ён будзе ім адным. Хто пойдзе гэтым шляхам, нават і нявопытныя, не заблудзяцца. Ільва там ня будзе, і драпежны зьвер ня ўзыдзе на яго; яго ня знойдзецца там, а хадзіцьмуць адкупленыя. І вернуцца збаўленыя Госпадам, прыйдуць на Сіён з радасным гоманам; і радасьць вечная будзе над галавою ў іх; яны знойдуць радасьць і весялосьць, а смутак і зітханьне адыдуць

**Іс 35:1 – 10**

### 2. Прароцтваў Ісаі чытаньня.

Спрагненыя! ідзеце ўсе да водаў; нават і вы, у каго няма срэбра, ідзеце, купляйце і ежце; ідзеце, купляйце бяз срэбра і бяз платы віно і малако. Навошта вам наважваць срэбра за тое, што ня хлеб, і заробак свой за тое, што не насычае? Паслухайце ўважліва і ежце дабро, і душа вашая хай раскашуецца тлушчам. Прыхілеце вуха ваша і прыйдзеце да Мяне; паслухайце, і жывая будзе душа вашая, - і дам вам запавет вечны, нязьменныя міласьці, абяцаныя Давіду. Вось, Я даў Яго ў сьведкі народам, у правадыры і настаўнікі народам. Вось,ты заклічаш народ, якога ты ня ведаў, і народы, якія цябе ня ведалі, пасьпяшаюцца да цябе дзеля Госпада Бога твайго і дзеля Сьвятога Ізраілевага, бо Ён праславіў цябе. Шукайце Госпада, калі можна знайсьці Яго; клічце Яго, калі Ён блізка. Хай пакіне бязбожнік дарогу сваю і беззаконьнік - намыслы свае, і хай зьвернецца да Госпада, - і Ён памілуе яго, і да Бога нашага, - бо Ён мілажальны. Мае думкі - ня вашыя думкі, ні вашыя шляхі - не Мае шляхі, кажа Гасподзь. Але Як неба вышэй за зямлю, так дарогі Мае вышэй за дарогі вашыя, і думкі Мае вышэй за думкі вашыя. Як дождж і сьнег зыходзяць зь неба і туды не вяртаюцца, а напойваюць зямлю і робяць яе здольнаю радзіць і вырошчваць, каб яна давала насеньне таму, хто сее, і хлеб таму, хто есьць, так і слова Маё, якое зыходзіць з вуснаў Маіх, - яно не вяртаецца да Мяне марным, а выконвае тое, што Мне заўгодна, і зьдзяйсьняе тое, на што Я паслаў яго. Дык вось, вы выйдзеце зь весялосьцю і вас правядуць зь мірам; горы і пагоркі будуць сьпяваць перад вамі песьню, і ўсе дрэвы ў полі - пляскаюць вам. Замест

## Трапары на водасьвяцьця, тон 8

Голас Госпада заклікае на водах, гаворачы: / "Прыйдзіце, прыміце усё / Духу прамудрасьці, Духу розуму, / Духу страху Бскага, / з'явіўшагася Хрыста!" *(3)*

У гэты дзень асьвячаецца вод існасьць, / і падзяляецца Ярдан, / і утрымлівае плынь бруі свае, / бачачы Уладара амываемым. *(2)*

Як чалавек да ракі прыйшоў Ты, Цар-Хрыстос, / і слугі сьпяшаешся прыняць вадохрышча, Добры, / ад рук Папярэдніка / для ачышчэньня грахоў нашых, Чалавекалюбчы. *(2)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 8:** Да голасу клікаючага ў пустэльні: / "Прыгатуйце шлях Госпаду" / прыйшоў Ты, Госпад, прыняўшы выяву слугі, / просячы аб вадохрышчы, не ведаючы граху. / Убачылі Цябе воды і жахнуліся, / у трапятаньне прыйшоў Папярэднік і выклікнуў гаворачы: / "Як сьвяцільнік адукуе Сьвятло? / Як ускладзе руку слугі на Уладара? / Асьвяці мяне і воды, Выратавальнік, прымаючы сусьвету грахі!"

**Сьвятра альбо дыякан:** Мудрасьць

### 1. Прароцтваў Ісаі чытаньня.

Разьвесяліцца пустыня і сухая зямля, і зарадуецца краіна ненаселеная і расквітнее як нарцыс; цудоўна будзе цьвісьці і радавацца, будзе ўрачысьціцца і сьвяткаваць; слава Лівана дасца ёй, хараство Карміла і Сарона; яны ўбачаць славу Госпада, веліч Бога нашага. Умацуйце аслабелыя рукі, і ўцьвердзіце калені дрыготкія; скажэце нясьмелым душою: будзьце цьвёрдыя, ня бойцеся; вось Бог ваш, прыйдзе помста, адплата Божая; Ён прыйдзе і збавіць вас. Тады адамкнуцца вочы сьляпых, і вушы глухіх расчыняцца. Тады кульгавы падхопіцца, як алень, і язык нямка засьпявае; бо праб'юцца воды ў пустыні і ў стэпе патокі. ператворыцца прывід водаў у возера, і спрагненая зямля - у крыніцы водаў; у жытлішчы шакалаў, дзе яны спачываюць, будзе месца пад трысьнёг і чарот. І будзе там вялікая дарога, і шлях па ёй назавецца шляхам сьвятым; нячысты ня будзе



надзея на Госпада Бога ягонага, Які стварыў неба і зямлю, мора і ўсё, што ў іх, Які вечна захоўвае вернасьць, творыць суд пакрыўджаным, дае хлеб галодным. Госпадзь вызваляе вязьняў; Госпадзь размыкае вочы сьляпым, Госпадзь сагнутых выпроствае; Госпадзь любіць праведных. Госпадзь ахоўвае прыхадняў, падтрымлівае сірату і ўдаву; а шлях бязбожных - скрыўляе. Госпадзь будзе валадарыць вечна, Бог твой, Сіёне, з роду ў род. Алілуя.

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Адзінародны Сын і Слова Боскае! / Несьмяротны і дабраваліўшы дзеля выратаваньні нашага / увасобіцца ад Сьвятой Багародзіцы і Заўсёды дзевы Марыі, / нязьменна учалавечыўся і укрыжаваны, Хрысьце Божа, / сьмерцю сьмерць зваяваўшы, / Адзін з Сьвятой Тройцы, / усяслаўны з Айцом і Сьвятым Духам, збаў нас!

*Дабрашчасныя без сьпеву:*

Ва Царстве Тваім успомні нас, Госпад, калі прыйдзеш ва Уладарстве Тваім.

Дабрашчасныя жабракі духам, бо іх ёсьць Царства Нябеснае.

Дабрашчасныя якія плачуць, бо яны суцешацца.

Дабрашчасныя рахманыя, бо яны атрымліваюць у спадчыну зямлю.

Дабрашчасныя прагнуць праўды, бо яны насыцяцца.

Дабрашчасныя літасьцявыя, бо яны збаўлены будуць.

Дабрашчасныя чыстыя серцам, бо яны Бога пабачаць.

Дабрашчасныя міратворцы, бо яны будуць названы сынамі Боскімі.

Дабрашчасныя гнаныя за праўду, бо іх ёсьць Царства Нябеснае.

Дабрашчасныя вы, калі будуць панасіць вас і гнаць і усяляк несправядліва зласловіць за Мяне.

Радуйцеся і весяліцеся, бо вялікая ваша узнагарода на нябёсах.

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Памяні нас, Госпад, калі прыйдзеш у Царстве Тваім.

Памяні нас, Уладар, калі прыйдзеш у Царстве Тваім.

Памяні нас, Сьвяты, калі прыйдзеш у Царстве Тваім.

Хор нябёсны асьпявае Цябе і заклікае: "Сьвяты, Сьвяты, Сьвяты, Госпад Саваоф, поўныя нябёсы і зямля славаю Тваёй!"

**Верш:** Прыйдзіце да Яго і адукуецеся, і твары вашы не пасаромяцца.

Хор нябёсны асьпявае Цябе і заклікае: "Сьвяты, Сьвяты, Сьвяты, Госпад Саваоф, поўныя нябёсы і зямля славаю Тваёй!"

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

Хор сьвятых Анёлаў і Арханёлаў са усімі нябёснымі Сіламі асьпявае Цябе і заклікае: "Сьвяты, Сьвяты, Сьвяты, Госпад Саваоф, поўныя нябёсы і зямля славаю Тваёй!"

Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

## Сымбаль веры[3]

Верую ў адзінага Бога Айца, усеўладарнага, Тварца неба і зямлі, усяго бачнага й нябачнага.

І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, адзінароднага, ад Айца роджанага перад усімі вякамі: Сьвятло ад Святла, Бога праўдзівага ад Бога праўдзівага, нястворанага, але народжанага, адзінаіснага з Айцом, праз Якога ўсё сталася.

Ен дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўленьня зыйшоў зь неба й прыняў цела ад Духа Сьвятога й Дзевы Марыі, і стаўся Чалавекам; быў укрыжаваны за нас пры Понцкім Пілаце, і пакутаваў і быў пахаваны і ўваскрос на трэці дзень, згодна з Пісаньнем; узыйшоў у нябёсы і сядзіць праваруч Айца; і зноў прыйдзе ў славе судзіць жывых і памерлых, і Ягонаму валадарству ня будзе канца.

Верую ў Духа Сьвятога, Госпада жыцьцятворчага, Які ад

[3] Калі служыцца Сьв. Літургія – сымбаль веры прапускаецца.



## Пракімен, тон 3

Гасподзь - сьвятло маё і ратунак мой: каго мне баяцца?

**Верш:** Гасподзь - цьвярдыня жыцьця майго: каго мне палохацца?

**Пс 26:1**

*Першае пасланьня да Карынфянаў сьвятога Апостала Паўла, пачатак 143а*

*Калі сыбота альбо нядзеля – тое ж пасланьня, пачатак 143б*

## Алілуя, тон 6

**Верш:** Маё сэрца вылілася добрым словам; я кажу: песьня мая пра Цара.

**Верш:** Ты прыгажэйшы за сыноў чалавечых.

**Пс 44:2а, 3а**

*Евангельля ад Лукаша, пачатак 9.*

## Замест "Годна:"

Аб Табе радуецца, Дабрадатная, усё тварэньне: / Анёльскія хары і чалавечы род. / Ты - асьвячоны храм і рай духоўны, / слава дзявоцтва, ад Якой Бог увасобіўся і Немаўлём стаў / перш усіх стагодзьдзяў Наяўны Бог наш. / Бо улоньня Тваё Ён у пасад пераўтварыў / і улоньне Тваё шырэй нябёсаў зрабіў. / Аб Табе радуецца, Дабрадатная, усё тварэньне, / слава Табе!

## Прычасьнік

Хвалеце Госпада зь нябёсаў, хвалеце Яго ў вышынях.

**Пс 148:1**

Алілуя. *(3)*

*Пасьля заамбоннай малітвы усё выходзім Царскай брамай да сьвятой хрысьцільні або на крыніцу. Ігумен або старэйшы з сьвятароў выходзіць, нясучы на галаве сьвяты Крыж, а наперадзе ідуць сьвечканосцы і дыяканы з кадзіламі. І кладзе сьвяты Крыж на добраўпрыожанам стале, дзе прыгатаваныя чара з вадой і са сьвечкамі. Раздаюцца сьвечкі брацii і сьвятар у суправаджэньні дыякана са сьвечкай кадзіць вакол стала і усю царкву, клір жа сьпявае трапары.*

пачуй мяне! Хай спазнае народ гэты, што Ты, Госпадзе, Бог, і Ты павернеш сэрца іхняе да Цябе. І апаў агонь Гасподні і зжэр цэласпаленьне і дровы, і камяні і пыл, і паглынуў ваду, якая ў рове. Убачыўшы гэта, увесь народ упаў на аблічча сваё і сказаў: Гасподзь ёсьць Бог, Гасподзь ёсьць Бог!

**3 Цар 18:30 – 39.**

### 12. Чацьвёртай кнігі Царстваў чытаньня.

І сказалі жыхары таго горада Ялісею: вось, стан гэтага горада добры, як бачыць гаспадар мой; але вада нядобрая і зямля неўрадлівая. І сказаў ён: дайце мне новую чару і пакладзеце туды солі. І далі яму. І выйшаў ён да вытоку вады, і кінуў туды солі, і сказаў: так кажа Гасподзь: Я зрабіў ваду гэтую здаровую, ня будзе ад яе наперад ні сьмерці, ні неўрадлівасьці. І вада зрабілася здаровую да сёньня, паводле слова Елісея, якое ён сказаў.

**4 Цар 2:19 – 22.**

### 13. Прароцтваў Ісаі чытаньня.

Так кажа Гасподзь: у час спрыяльны Я пачуў Цябе, і ў дзень выратаваньня дапамог Табе; і Я буду ахоўваць Цябе і зраблю Цябе запаветам народу, каб узнавіць зямлю, каб вярнуць спадчыньнікам спадчыну спусташэньня, сказаў вязьням: «выходзьце», і тым, якія ў цемры: «пакажэцеся». Яны пры дарогах будуць пасьвіць, і на ўсіх пагорках будуць пашы іхнія; ня будуць цярпець голаду і смагі, і не дастане іх сьпёка і сонца; бо Той, Хто мілуе іх, будзе весьці іх і прывядзе іх да крыніцы водаў. І ўсе горы Мае зраблю шляхам, і дарогі Мае будуць паднятыя. Вось, яны прыйдуць здалёку; і вось, - адны з поўначы і мора, а другія - зь зямлі Сінім. Радуйцеся, нябёсы, і весяліся, зямля, і гудзеце, горы, ад радасьці; бо суцешыў Гасподзь народ Свой і памілаваў пакутнікаў Сваіх. А Сіён казаў: “пакінуў мяне Гасподзь, і Бог мой забыў мяне!” Ці забудзе жанчына немаўля сваё, каб не пашкадаваць сына ўлоньня свайго? але калі б і яна забыла, дык Я не забуду цябе.

**Іс 49:8 – 15.**

*Пасьля 13 парыміі – малая екценьня, малітва Трысьвятога і сьпяваем Трысьвятое*



Айца зыходзіць, Каму нароўні з Айцом і Сынам пакланеньне й слаўленьне належаць, і Які вяшчаў праз пракокаў.

Верую ў адзіную Сьвятую, Саборную і Апостальскую Царкву.

Вызнаю адзін хрост на збаўленьне ад грахоў.

Чакаю ўваскрасеньня памерлых і жыцьця будучага веку. Амін.

Прыслаб, адпусьці, прабач, Божа, грахі нашы вольныя і міжвольныя, зробленыя справай і словам, сьвядома і па недасьведчанасьці, уначы і днём, у розуме і думках, - усё нам прабач, як Добрая і Чалавекалюбча.

Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвяціся імя Твае, прыдзі ўладарства Твае, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзёнага дай нам сёньня, і адпусьці нам грахі нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым; і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога.

**Сьвятар:** Бо Тваё ёсьць валадарства, і сіла, і слава, Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Чытальнік:** Амін

### Кандак, тон 4

Стоячы ў бруях Ярданскіх у гэты дзень, Госпад /Яну прамаўляе: / “Не бойся ахрысьціць Мяне, / бо Я прыйшоў выратаваць Адама першароднага!”

Госпадзі, памілуй. *(40)*

### І малітва:

Усясьвятая Тройца, адзінасутнае Валадарства, непадзельнае Царства, Падстава усіх дабротаў! Дабравалі жа і аб мне, грэшным: зацвердзі, асьвяці сэрца маё і адкінь ад мяне усякую брыдоту, адукуй мае думкі, каб мне заўсёды славіць, асьпяваць, пакланяцца і усклікаць: “Адзін Сьвяты, адзін Госпад, Ісус Хрыстос, у славу Бога Айца”. Амін.

*Калі Сьв. Літургія служыцца:*

**Сьвятар:** Мудрасьць.

**Хор:** Годна ёсьць сапраўды / услаўляць Цябе, Багародзіцу, /

вечна дабрашчасную і усячыстую / і Маці Бога нашага.

**Сьвятар:** Усясьвятая Богародзіца, збаў нас!

**Хор:** Гонарам вышэйшую Хэрувімаў / і без параўнаньня больш слаўную за Сэрафімаў, / нявінна Бога-Слова нарадзіўшую, / праўдзівую Багародзіцу - Цябе ўзьвялічваем.

**Сьвятар:** Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе.

**Хор:** Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Госпадзі, памілуй. *(тройчы)*

Дабраславі.

*Сьвятар робіць водпуск*

*Калі Сьв. Літургія не служыцца:*

Ды будзе імя Госпада дабраслаўлёна ад сёньня і на вякі вякоў. *(тройчы)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

## Псальма 33

Дабраслаўляю Госпада ва ўсякую пору; хвала Яму няспынная ў вуснах маіх. Госпадам будзе хваліцца душа мая; пачуюць пакорныя і ўзьвяселяцца. Вялічайце Госпада са мною, і ўзносьма імя Ягонае разам. Я шукаў Госпада, і Ён пачуў мяне і ад усякіх небясьпекаў маіх вызваліў мяне. Хто прыглядваўся да Яго, тыя прасьвятліліся, і твары іхнія ня зьведаюць сораму. Вось убогі паклікаў, - і Гасподзь пачуў і ўратаваў яго ад усіх ягоных бедаў. Гасподні анёл паўстае вакол тых, хто баіцца Яго, - і іх вызваляе. Паспытайце і ўбачыце, які добры Гасподзь! Дабрашчасны той чалавек, што на яго спадзяецца! Бойцеся Госпада, усе сьвятыя Ягоныя; бо ня маюць нястачы тыя, што баяцца Яго. Ільвяняты церпяць нягоды і голад, а богашукальнікі ня церпяць нястачы ні ў якім дабры. Прыйдзеце, дзеці, паслухайце мяне: страху Гасподняму вас навучу. Ці хоча чалавек жыць і ці любіць дабрадзенства, каб бачыць дабро? Трымай язык свой ад злога і вусны свае ад падступных словаў. Ухіляйся ад ліха і рабі дабро; шукай міру і йдзі за ім. Вочы


яна мамчыла табе немаўля? Дачка фараонава сказала ёй: сходзі. Дзяўчына пайшла і паклікала маці немаўляці. Дачка фараонава сказала ёй: вазьмі гэтае немаўля і мамчы яго мне; я заплачу табе. Жанчына ўзяла немаўля і мамчыла яго. І вырасла немаўля, і яна прывяла яго да дачкі фараонавай, і ён быў у яе за сына, і дала яму імя: Майсей, бо, казала яна, я з вады дастала яго.

**Вых 2:5 – 10.**

## 10. Кнігі Судьдзяў чытаньня.

І сказаў Гедэон Богу: калі Ты выратуеш Ізраіля рукою маёю, як казаў Ты, дык вось, я пасьцялю ў гумне стрыжаную воўну: калі раса будзе толькі на воўне, а на ўсёй зямлі суха, дык буду ведаць, што выратуеш рукою маёю Ізраіля, як казаў Ты. Так і сталася: на другі дзень, устаўшы рана, ён пачаў выціскаць воўну і выціснуў з воўны расы цэлую чару вады. І сказаў Гедэор Богу: ня гневайся на мяне, калі яшчэ раз скажу і яшчэ толькі адзін раз учыню выпрабаваньне над воўнаю: хай будзе суха на адной толькі воўне, а на ўсёй зямлі хай будзе раса. Бог так і зрабіў у тую ноч: толькі на воўне было суха, а на ўсёй зямлі была раса.

**Суд 6:36 – 40.**

## 11. Трэцьцяй кнігі Царстваў чытаньня.

Тады Ільля сказаў усяму народу: хадземце да мяне. І падышоў увесь народ да яго. Ён аднавіў разбураны ахвярнік Гасподні. І ўзяў Ільля дванаццаць камянёў, па колькасьці каленаў сыноў Якава, якому Гасподзь сказаў так: Ізраіль будзе імя тваё. І пабудаваў з гэтых камянёў ахвярнік у імя Госпада, і зрабіў вакол ахвярніка роў, ёмістасьцю ў дзьве саты зерня, і паклаў дровы, і расьсек цяля, і паклаў яго на дровы, і сказаў: напоўніце чатыры вядры вады і вылівайце на ўсепальную ахвяру і на дровы. Потым сказаў: паўтарэце. І яны паўтарылі. І сказаў: зрабеце тое самае трэці раз. І зрабілі трэці раз, і вада палілася вакол ахвярніка, і роў напоўніўся вадою. У час ахвяразпрынашэньня вечаровай ахвяры падышоў Ільля прарок - і сказаў: Госпадзе Божа Абрагамаў, Ісакаў і Ізраілеў! Хай спазнаюць у гэты дзень, што Ты адзін Бог у Ізраілі, і што я раб Твой і зрабіў усё паводле слова Твайго. Пачуй мяне, Госпадзе,

заступайцеся за ўдаву. Тады прыйдзеце, і рассудзім, кажа Гасподзь. Калі будуць грахі вашыя, як барвовае, - як сьнег адбялю; калі будуць чырвоныя, як пурпура, - як воўну адбялю. Калі захочаце і паслухаецеся, дык есьцімеце даброты зямлі. Калі ж адмовіцеся і будзеце ўпарціцца, дык меч зжарэ вас: бо вусны Гасподнія маўляюць.

**Іс 1:16 – 20.**

### 8. Быцьця чытаньня.

І Якаў пайшоў дарогай сваёю. І сустрэлі яго анёлы Божыя. Якаў, убачыўшы іх, сказаў: гэта рушэньне Божае. І даў імя месцу таму: Маханаім. І паслаў Якаў перад сабою пасланцоў да брата свайго Ісава ў зямлю Сэір, у вобласьць Эдом, і загадаў ім, сказаўшы: так скажэце гаспадару майму Ісаву: вось, што кажа раб твой Якаў: я жыў у Лавана і пражыў дагэтуль; і ёсьць у мяне валы і аслы і дробнае быдла, і рабы і рабыні; і я паслаў абвясьціць пра сябе гаспадару майму, каб знайсьці ўпадабаньне перад вачыма тваімі. І вярнуліся пасланцы да Якава і сказалі: мы хадзілі да брата твайго Ісава; ён ідзе напярэймы табе, і зь ім чатырыста чалавек. Якаў вельмі спалохаўся і сумеўся; і падзяліў людзей, якія былі зь ім, і быдла дробнае і буйное і вярблюдаў, на два табары. І сказаў: калі Ісаў нападзе на адзін табар і паб'е яго, дык другі табар можа ўратавацца. І сказаў Якаў: Божа бацькі майго Абрагама і Божа бацькі майго Ісаака, Госпадзе, Які сказаў мне: вярніся ў зямлю тваю, на радзіму тваю, і Я буду дабрачыніць табе! Нявартны я ўсіх ласкаў і ўсіх дабрачынстваў, якія ты ўчыніў рабу Твайму; бо я з кіем маім перайшоў гэты Ярдан, а цяпер у мяне два табары.

**Быц 32:1 – 10.**

### 9. Выхаду чытаньня.

І выйшла дачка фараонава на раку мыцца, а прыслужніцы яе хадзілі па беразе ракі. Яна ўбачыла кош сярод трысьнягу і паслала рабыню сваю ўзяць яго. Адкрыла і ўбачыла немаўля; і вось, дзіця плача; і ўмілажалілася зь яго і сказала: гэта з Габрэйскіх дзяцей. І сказала сястра яго дачцэ фараонавай: ці не схадзіць мне і ці не паклікаць да цябе карміцельку з Габрэек, каб



Гасподнія - на праведных, і вушы Ягоныя - на скаргу іхнюю. А аблічча Гасподняе - супроць тых, што робяць ліхое, каб зьвесьці зь зямлі памяць пра іх. Клічуць, і Гасподзь чуе, і ад усіх уціскаў іх вызваляе. Блізкі Гасподзь да тых, у каго зламанае сэрца, і пакорлівых духам - уратуе. Многа турботаў у праведніка, і ад усіх іх Гасподзь вызваляе. Ён хавае ўсе косткі ягоныя; і ніводная не паламаецца! Зло заб'е грэшніка, і ненавісьнікі праведнасьці загінуць. Гасподзь вызваліць душу рабоў Сваіх, і не загіне ніхто, хто на Яго спадзяецца.

**Сьвятар:** Мудрасьць.

**Хор:** Годна ёсьць сапраўды / услаўляць Цябе, Багародзіцу, / вечна дабрашчасную і усячыстую / і Маці Бога нашага.

**Сьвятар:** Усясьвятая Богародзіца, збаў нас!

**Хор:** Гонарам вышэйшую Хэрувімаў / і без параўнаньня больш слаўную за Сэрафімаў, / нявінна Бога-Слова нарадзіўшую, / праўдзівую Багародзіцу - Цябе ўзьвялічваем.

**Сьвятар:** Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе.

**Хор:** Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Госпадзі, памілуй. *(тройчы)*

Дабраславі.

*Сьвятар робіць водпуск*

## НА ВЯЛІКАЙ ВЯЧОРНЯЙ

### На “Госпада клічу:” вершыры на 8, тон 2

Асьветніка нашага, / адукоўваючага усякага чалавека, / Папярэднік, убачыўшы прыйшоўшым хрост прымаць, / радуецца душою і трымціць рукой, / паказвае на Яго і абвяшчая людзям: / "Вось Збавіцель Ізраіля, / вызваляючы нас ад тленьня!" / О бязгрэшны Хрысьце Божа наш, слава Табе! *(2)*

Калі Збавіцель наш ад слугі прымаў вадохрышча / і быў сьведчым спасланьня Сьвятога Духу, / жахаліся, бачачы гэта, палкі Анёлаў, / а з нябёсаў пачулі голас Айца: / “Гэты, на Якога Папярэднік ускладае руку, - / Сын Мой, Умілаваны, на Кім Маё дабраваленьня”. / Хрысьце Божа наш, слава Табе! *(2)*

Ярданскія бруі прынялі Цябе, Крыніца, / і Суцяшальнік у выглядзе голуба сыходзіў. / Схіляе галаву Прыхіліўшы нябёсы, / ускліча і заклікае гліна Разьбяру: / “Што Ты мне загадваеш, то што вышэй сіл маіх? / Я патрабуюся ў хросьце ад Цябе!”. / О бязгрэшны Хрысьце Божа наш, слава Табе! *(2)*

Выратаваць жадаючы заблукаўшага чалавека, / не пагрэбаваў Ты апрануцца ў выяву слугі, - / бо годна Табе, Уладару і Богу, / прыняць нашу прыроду дзеля нас; / бо Ты, Збавіцель, прыняўшы хрост плоцьцю / прабачэньня удастоіў нас. / Таму мы заклікаем Табе: / “Дабрадзей Хрысьце Божа наш, слава Табе!” *(2)*

Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Тон 2, Візантыйца**

Схіліў Ты галаву пад руку Папярэдніка, / зьнішчыў галовы зьмеяў; / з'явіўся ў бруях і асьвяціў увесь сусьвет, / каб усё славілі Цябе, Выратавальнік, / Асьвета душаў нашых.

*Уваход. Пракімен дня. І чытаньня сьвята з трапарямі і з вершамі.*

**1. Быцьця чытаньня.**

На пачатку стварыў Бог неба і зямлю. А зямля была нябачная і пустая і цемра над безданьню, і Дух Божы лунаў над вадою. І сказаў Бог: хай будзе сьвятло. І сталася сьвятло.
4. І ўбачыў Бог сьвятло, што яно добра, і аддзяліў Бог сьвятло ад цемры. І назваў Бог сьвятло днём, а цемру ноччу. І быў вечар, і была раніца: дзень адзін. І сказаў Бог: хай будзе цьвердзь пасярод вады, і хай аддзяляе яна ваду ад вады. І стварыў Бог цьвердзь, і аддзяліў ваду, якая пад цьвердзю, ад вады, якая над цьвердзю. І сталася так. І назваў Бог цьвердзь небам. І быў вечар, і была раніца: дзень другі. І сказаў Бог: хай зьбярэцца вада, якая пад небам, у адно месца, і хай явіцца суша. І сталася так. І назваў Бог сушу зямлёю, а збор вады назваў морамі. І ўбачыў Бог, што гэта добра. І сказаў Бог: хай уродзіць зямля зеляніну, траву, каб сеяла насеньне, дрэва плоднае, каб радзіла паводле роду свайго плод, у якім насеньне яго на зямлі. І



наш, / па мностве міласэрнасьці Тваёй, - / бо дзе змоглася бы сьвятло Твой зазьзяць, / акрамя як над сядзячымі у цемры? / Слава Табе!

**Чытальнік:** Царуе Гасподзь; Ён у веліч убраны, / убраны Гасподзь у магутнасьць і перапаясаны: / сусьвет таму цьвёрды, ня зрушыцца. / Трон Твой угрунтаваны спаконвечна; / Ты - ад вечнасьці.

**Пс 92:1-2**

**Хор:** Бо дзе змоглася бы сьвятло Твой зазьзяць, / акрамя як над сядзячымі у цемры? / Слава Табе!

**Чытальнік:** Узвышаюць рэкі, Госпадзе, узвышаюць рэкі голас свой, / узвышаюць рэкі хвалі свае.

**Пс 92:3**

**Хор:** Бо дзе змоглася бы сьвятло Твой зазьзяць, / акрамя як над сядзячымі у цемры? / Слава Табе!

**Чытальнік:** Але над шумам водаў вялікіх, моцных хваляў марскіх, / моцны ў вышыных Гасподзь. Сьведчаньні Твае бяз сумненьня пэўныя. / Дому Твайму, Госпадзе, належыць сьвятасьць на доўгія дні.

**Пс 92:4, 5**

**Хор:** Бо дзе змоглася бы сьвятло Твой зазьзяць, / акрамя як над сядзячымі у цемры? / Слава Табе!

**Чытальнік:** Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

**Хор:** Бо дзе змоглася бы сьвятло Твой зазьзяць, / акрамя як над сядзячымі у цемры? / Слава Табе!

**Чытальнік:** Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Хор:** Бо дзе змоглася бы сьвятло Твой зазьзяць, / акрамя як над сядзячымі у цемры? / Слава Табе!

**Чытальнік:** Грэшнікам і мытарам / з'явіўся Ты, Выратавальнік наш, / па мностве міласэрнасьці Тваёй, - / бо дзе змоглася бы сьвятло Твой зазьзяць, / акрамя як над сядзячымі у цемры? / Слава Табе!

**7. Прароцтваў Ісаі чытаньня.**

Абмыйцеся, ачысьціцеся; адвядзеце ліхія ўчынкі вашыя ад вачэй Маіх; перастаньце рабіць зло; навучэцеся рабіць дабро; шукайце праўды; ратуйце прыгнечанага; абараняйце сірату;

дух, які ў табе, хай будзе на мне ўдвая. І сказаў ён: цяжкага ты просіш; калі ўбачыш, як я буду ўзяты ад цябе, дык будзе табе так, а калі ня ўбачыш, ня будзе. Калі яны ішлі і па дарозе гутарылі, раптам зьявілася калясьніца вогненная і коні вогненныя, і разлучылі іх абодвух, і панёсься Ільля ў віхуры на неба. А Елісей глядзеў і ўсклікнуў: бацька мой, бацька мой, калясьніца Ізраіля і коньніца ягоная! І ня бачыў яго болей. І схапіў ён вопратку сваю і падраў яе на дзьве часткі. І падняў аўчыну Ільлі, якая ўпала зь яго, і пайшоў назад, і стаў на беразе Ярдана; і ўзяў аўчыну Ільлі, якая ўпала зь яго, і ўдарыў ёю па вадзе і сказаў: дзе Гасподзь, Бог Ільлі, - Ён Самы? І ўдарыў па вадзе, і яна расступілася туды і сюды, і перайшоў Ялісей.

**4 Цар 2:6 – 14.**

### 6. Чацьвёртай кнігі Царстваў чытаньня.

І прыбыў Нэеман на конях сваіх і на калясьніцы сваёй і спыніўся каля ўваходу ў дом Ялісееў. І выслаў да яго Елісей слугу сказаць: ідзі, абмыйся сем разоў у Ярдане, і абновіцца цела тваё ў цябе, і будзеш чысты. І разгневаўся Нэеман, і пайшоў, і сказаў: вось, я думаў, што ён выйдзе, стане, і пакліча імя Госпада Бога свайго, і пакладзе руку сваю на тое месца, і здыме праказу; хіба Авана і Фарфар, рэкі Дамаскія, ня лепшыя за ўсе воды Ізраільскія? хіба я ня мог бы абмыцца ў іх і ачысьціцца? І павярнуўся і пайшоў у гневе. І падышлі рабы ягоныя, і казалі яму, і сказалі: бацька мой, калі б што-небудзь важнае сказаў табе прарок, дык ці не зрабіў бы ты? а тым болей, калі ён сказаў табе толькі: абмыйся, і будзеш чысты. І пайшоў ён і акунуўся ў Ярдане сем разоў, па слове чалавека Божага, і абнавілася цела ягонае, як цела малога дзіцяці, і ачысьціўся.

**4 Цар 5:9 – 14.**

### Трапар, тон 6

**Чытальнік:** Грэшнікам і мытарам / з'явіўся Ты, Выратавальнік наш, / па мностве міласэрнасьці Тваёй, - / бо дзе змоглася бы сьвятло Твой зазьзяць, / акрамя як над сядзячымі у цемры? / Слава Табе!

**Хор:** Грэшнікам і мытарам / з'явіўся Ты, Выратавальнік



сталася так. І ўтварыла зямля зеляніну, траву, што сеяла насеньне паводле роду яе, і дрэва, што радзіла плод, у якім насеньне паводле роду ягонага. І ўбачыў Бог, што гэта добра. І быў вечар, і была раніца: дзень трэці.

**Быц 1:1 – 13**

### 2. Выхаду чытаньня.

І сказаў Гасподзь Майсею: чаго ты крычыш да Мяне? скажы сынам Ізраілевым, каб яны ішлі; а ты падымі посах твой, і працягні руку тваю на мора, і падзялі яго, і пройдуць сыны Ізраілевыя сярод мора па сухім; А Я зраблю чэрствым сэрца Егіпцянам, і яны пойдуць сьледам за імі; і пакажу славу Маю на фараоне і на ўсім войску ягоным і на верхаўцах ягоных: І спазнаюць Егіпцяне, што Я Гасподзь, калі пакажу славу Маю на фараоне, на калясьніцах ягоных і на вераўцах ягоных. І прасьцёр Майсей руку сваю на мора, і гнаў Гасподзь мора моцным усходнім ветрам усю ноч і зрабіў мора сушаю; і расступіліся воды. І пайшлі сыны Ізраілевыя сярод мора па сухім: а воды былі ім сьцяною з правага і зь левага боку. Пагналіся Егіпцяне, і ўвайшлі за імі ўсярэдзіну мора ўсе коні фараонавыя, калясьніцы ягоныя і верхаўцы ягоныя. І прасьцёр Майсей руку сваю на мора, і пад раніцу вада вярнулася ў сваё месца; а Егіпцяне беглі насустрач. Так патапіў Гасподзь Егіпцянаў сярод мора. І вада вярнулася і пакрыла калясьніцы і верхаўцоў усяго войска фараонавага, якія ўвайшлі за імі ў мора; не засталося ніводнага зь іх. А сыны Ізраілевыя прайшлі па сушы сярод мора: воды былі ім сьцяною па правы і па левы бок.

**Вых 14:15 – 18, 21 – 23, 27 – 29**

### 3. Выхаду чытаньня.

І павёў Майсей Ізраільцянаў ад Чэрмнага мора, і яны ўступілі ў пустыню Сур; і ішлі яны тры дні па пустыні і не знаходзілі вады. Прыйшлі ў Мэру - і не маглі піць вады ў Мэры, бо яна была горкая, чаму і дадзена таму месцу назва: Мэра. І наракаў народ на Майсея, кажучы: што нам піць? Майсей загаласіў да Госпада, і Гасподзь паказаў яму дрэва, і ён кінуў яго ў ваду, і вада зрабілася салодкая. Таму Бог даў народу

статут і закон і там выпрабоўваў яго. І сказаў: калі ты будзеш слухацца голасу Госпада, Бога твайго, і рабіць вартаснае перад вачамі Яго, і слухацца запаведзяў Ягоных, і шанаваць усе статуты Ягоныя, дык не навяду на цябе ніякай хваробы, якія навёў Я на Егіпет: бо Я Гасподзь, Які ацаляе цябе. І прыйшлі ў Элім: там было дванаццаць крыніц вады і семдзесят пальмавых дрэў, і разьмясьціліся там табарам каля водаў. І рушылі з Эліма, і прыйшло ўсё супольства сыноў Ізраілевых у пустыню Сін, што паміж Элімам і Сінаем, на пятнаццаты дзень другога месяца пасьля выхаду іх зь зямлі Егіпецкай.

**Вых 15:22 – 27; 16:1**

### Трапар, тон 5

**Чытальнік:** З'явіўся Ты ў сусьвеце, сусьвет Стварыўшы, / каб асьвяціць у цемры сядзячых. / Чалавекалюбчы, слава Табе!

**Хор:** З'явіўся Ты ў сусьвеце, сусьвет Стварыўшы, / каб асьвяціць у цемры сядзячых. / Чалавекалюбчы, слава Табе!

**Чытальнік:** Божа! будзь літасьцівы да нас і дабраславі нас, / асьвятлі нас абліччам Сваім, каб мы спазналі на зямлі дарогу Тваю, / ва ўсіх народах выратаваньне Тваё.

**Пс 66:2, 3**

**Хор:** Каб асьвяціць у цемры сядзячых. / Чалавекалюбчы, слава Табе!

**Чытальнік:** Хай уславяць народы Цябе, Божа; / хай уславяць усе народы Цябе. / Хай весяляцца і радуюцца плямёны; / бо Ты судзіш народы справядліва і кіруеш на зямлі плямёнамі

**Пс 66:4, 5**

**Хор:** Каб асьвяціць у цемры сядзячых. / Чалавекалюбчы, слава Табе!

**Чытальнік:** Хай уславяць народы Цябе, Божа, / хай уславяць усе народы Цябе. / Зямля дала плод свой: / хай дабраславіць нас Бог, Бог наш. / Хай дабраславіць нас Бог, / і хай збаяцца Яго ўсе межы зямлі.

**Пс 66:6 – 8**

**Хор:** Каб асьвяціць у цемры сядзячых. / Чалавекалюбчы, слава Табе!



**Чытальнік:** Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу!

**Хор:** Каб асьвяціць у цемры сядзячых. / Чалавекалюбчы, слава Табе!

**Чытальнік:** Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Хор:** Каб асьвяціць у цемры сядзячых.

**Чытальнік:** З'явіўся Ты ў сусьвеце, сусьвет Стварыўшы. / Каб асьвяціць у цемры сядзячых. / Чалавекалюбчы, слава Табе!!

### 4. Ісуса Навіна чытаньня.

Тады Гасподзь сказаў Ісусу: у гэты дзень Я пачну праслаўляць цябе на вачах ва ўсяго Ізраіля, каб яны ўведалі, што як Я быў з Майсеем, так буду і з табою; а ты дай загад сьвятарам, якія нясуць каўчэг запавету, і скажы: як толькі ўвойдзеце ў воды Ярдана, спынецеся ў Ярдане. Дык вось, калі народ рушыў ад сваіх намётаў, каб пераходзіць Ярдан, і сьвятары панесьлі каўчэг запавету перад народам, дык, як толькі тыя, што несьлі каўчэг увайшлі ў Ярдан, і ногі сьвятароў, што несьлі каўчэг, апусьціліся ў ваду Ярдана, вада, якая цякла зьверху, спынілася і стала сьцяною на даволі вялікай адлегласьці, да горада Адама, які каля Цартана; а што цякла ў мора раўніны, у мора Салёнае, пайшла і высахла. І народ пераходзіў насупраць Ерыхона; а сьвятары, якія несьлі каўчэг запавету Гасподняга, стаялі на сухім сярод Ярдана цьвёрдаю нагою. Усе Ізраілевыя пераходзілі па сухім, пакуль увесь народ не перайшоў празь Ярдан.

**Іс Нав 3:7 – 8, 14 – 17.**

### 5. Чацьвёртай кнігі Царстваў чытаньня.

І сказаў яму Ільля: застанься тут, бо Гасподзь пасылае мяне да Ярдана. І сказаў ён: жывы Гасподзь і жывая душа твая! не пакіну цябе. І пайшлі абодва. Пяцьдзясят чалавек з сыноў прарокавых пайшлі і сталі здалёк супроць іх, і яны абодва стаялі каля Ярдана. І ўзяў Ільля аўчыну сваю, і згарнуў, і ўдарыў ёю па вадзе, і расступілася яна туды і сюды, і перайшлі абодва па сухім. Калі яны перайшлі, Ільля сказаў Елісею: прасі, што зрабіць табе, перш чым я буду ўзяты ад цябе. І сказаў Елісей: